Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

НЯДЗЕЛЯ
28 лютага 1932 г.
№ 47 (3436)

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ. ПЕРАДАВЫ: Стварэньне насенных фондаў — вузлавая неадкладная задача. Ф. ВАЛЬФОВІЧ. Становішча кітайскага сялянства ў правінцыі Шаньсі, (2 стар.). КАНАКОЦІН, ФАЛЬКО, КАП-КІ. Няма бальшавіцкай настойлівасьці ў разгортваньні лёназагатовак. (3 стар.).
ПРА ХОД ЗАГАТОВАК НАСЕНЬНЯ. Пастанова СНКБ (1 стар.).
ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ ЗДАБЫТКІ НАВУКІ З ІНСТЫТУТАЎ, ДАСЬЛЕДЧЫХ СТАНЦЫЙ У САЎГАСЫ, МТС, КАЛГАСЫ. Адкрыты ліст т. ШАРАНГОВІЧА усяму цэнтральнаму і раённаму друку БССР. (1 стар.).
САПРАЎДНАЯ БЕЗАПАСНАСЬЦЬ—У РАЗБРАЕНЬНІ УСІХ КРАІН. Прамова тав. ЛІТВІНАВА (4 стар.).
Ня спадзяваньне на самацёк, а ўпартая штодзённая барацьба забясьпечыць ператварэньне БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці (2 стар.).
Скурзаводам — сыравіну (2 стар.).
Насеньне павінна быць у поўнай гатоўнасьці.
Дыспэтчары кіруюць рухам цягнікоў (3 стар.).

Стварэньне насенных фондаў--вузлавая, неадкладная задача

Вялічыня задач, якія стаяць перад намі ў трэцій бальшавіцкай вясьне вызначаюцца тымі лічбамі засеву, лічбамі ўзьняцьця ўраджайнасьці, якія намечаны партыяй і ўрадам на 1932 год.

У надыходзячую веснавую пасеўкампанію мы ў БССР павінны абсеяць плошчу ў 2.850 тыс. га, з якіх збожжам 1.160 тыс. га, бульбай—700 тыс. га, тэхкультурамі—370 тыс. га, кармовымі травамі—380 тыс. га і кораньплодамі—55 тыс. га, пры гэтым павінна быць забясьпечана ўзьняцьце ўраджайнасьці па збожжавых культурах на 12 проц., па травах і тэхкультурах—на 15 і па бульбе—на 20 проц.

Ня трэба даводзіць таго, што пасьпяховасьць правядзеньня веснавой сяўбы мае буйнейшае значэньне для выкананьня народна-гаспадарчага пляну чацьвёртага заключнага году пяцігодкі, што выкананьне пляну веснавой сяўбы азначае далейшыя посьпехі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі і новыя перамогі ў галіне ўзмацненьня сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі. Аднак, выканаць гэты план магчыма будзе толькі пры ўмове, калі кожны дзень, кожная гадзіна, якія засталіся да сяўбы, будуць прасякнуты балвой, сапраўды бальшавіцкай работай па падрыхтоўцы да сяўбы, калі партыйныя, савецкія і калгасныя арганізацыі на месцах сваячасова і моцна возьмуцца за асноўнае рашаючае зьвяно, мабілізуючы пярачэньня масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-адпасобнікаў для таго, каб выцягнуць увесь ланцуг мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць пасьпяховасьць правядзеньня веснавой сяўбы.

Збор насенных і страхавых фондаў зьяўляецца іменна тым асноўным зьвяном, тэй асноўнай задачай, за вырашэньне якой партыйным ячэйкам, сельсаветам і калгасам на месцах неабходна зараз-жа ўзяцца з усёй бальшавіцкай напорыстасьцю, памятуючы катэгарычнае папярэджаньне ЦК КП(б)Б і СНК аб тым, што «пасеўныя плошчы калгасаў і саўгасаў, а таксама і адпасобнікаў павінны быць забясьпечаны насеньнем цалкам з уласных рэсурсаў».

У падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, цэнтральнай задачай партыйных і савецкіх арганізацый на бліжэйшыя тыдні зьяўляецца «стварэньне насенных калгасных фондаў у разьмерах неабходных для поўнага выкананьня пасеўнага пляну» (З паст. ЦК УсеКП(б) і СНК СССР).

БССР згодна пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, павінна цалкам скончыць засыпку насенных фондаў да 1 красавіка. Аднак, тэмпы, якімі на сёньняшні дзень утвараецца гэта работа, ні ў якім разе не гарантуюць таго, што ў вызначаныя партыяй і ўрадам тэрміны мы скончым засыпку неабходных насенных фондаў. Досыць сказаць, што па 20 лютага план засыпкі насенных фондаў выкананы на 47 проц., страхавых—на 30,7. З рук вон дрэнна пастаўлена работа па загатоўцы насеньня. Такія раёны, як Магілеўскі, Чэрыкаўскі, Лельчыцкі, Жлобінскі, Веткаўскі, Гарадоцкі і Вушацкі лічэ амаль нічога не зрабілі ў справе засыпкі і загатоўкі насенных і страхавых фондаў.

Такое становішча тым больш недапушчальна, што зацяжка са зборам насенных і страхавых фондаў ёсьць буйнейшая перашкода сваячасоваму правядзеньню сортаабмену, ачыстцы і пратручваньню збожжа і г. д. Яно таксама зможа зьявіцца перашкодай для правядзеньня раньняга засеву зярнёвых, якое зьяўляецца неабходнейшай умовай узьняцьця ўраджайнасьці палёў.

Такое становішча ні ў якім разе не можа быць цярпімым. Дамагчыся карэннага пералому ў рабоце па засыпцы і загатоўцы насенных і страхавых фондаў у бліжэйшыя дні ёсьць важнейшая задача партыйных, савецкіх і калгасных арганізацый.

Трэба неадкладна на аснове папулярызацыі пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР разгарнуць шырачэйшую масавую работу сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-адпасобнікаў па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, пры гэтым трэба растлумачыць неабходнасьць не толькі забясьпечыць на сеў сваёй плошчы, але і арганізацыю дапамогі тым калгасам, дзе будзе адчувацца недахоп насеньня.

Магутнейшым ороджам стварэньня насенных калгасных фондаў зьяўляецца рэалізацыя пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Арганізацыя пастаянных брыгад з адводам ім адпаведнага вучастку зямлі, з канкрэтнымі заданьнямі па насеве і ўзьняцьці ўраджайнасьці, узьнімае адказнасьць усёй брыгады за сваячасовую засыпку насеннага фонду, падвышае зацікаўленасьць калгасьнікаў, разгортвае іх самадзейнасьць у мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, актывізуе калгасьнікаў ва ўсёй работе ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Адсюль вынікае тое, што ні ў якім разе нельга марудзіць з ажыцьцяўленьнем пастановы ЦК ад 4 лютага. Трэба неадкладна-ж узяцца за арганізацыю сталых брыгад, прымацаваўшы да іх адпаведную цягавую сілу, інвэнтар, адвёўшы ім зямельныя вучасткі.

МТС, якія паказалі бальшаўніцкія прыклады ў рабоце на збожжазагатоўках, павінны такія-ж прыклады паказаць у рабоце па засыпцы насенных фондаў.

Трэба зараз-жа з усёй сілай узарыць на антыпартыйных разважаньнях аб адсутнасьці насеньня, аб неабходнасьці завозу насеньня і г. д., якія ёсьць у некаторых раёнах. Гэтыя апартуністычныя разважаньні нічога агульнага ня маюць з сапраўднасьцю, пад імі хаваюцца кулацкамесьніцкія тэндэнцыі асобных работнікаў, накіраваныя на тое, каб утаіць ад дзяржавы наўчнае насеньне, пад імі хаваецца нежаданьне правых апартуністаў—гэтых кулацкіх агентаў разгарнуць работу па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў калгасаў і адпасобнага сэктару.

Трэба зараз-жа ў корані перасечы кулацкую агітацыю, накіраваную на тое, каб падарваць работу па стварэньні насенных і страхавых фондаў і гэтым самым сарваць веснавую пасеўную кампанію. Адначасова неабходна забясьпечыць ахову складоў, памятаючы, што клясавы вораг будзе імкнуцца нанесьці шкоду і на гэтым вучастку.

Барацьба за засыпку насенных фондаў павінна быць цесна ўвязана з работай па завяршэньні збожжазагатовак.

Самым рашучым чынам змагаючыся супроць кідывецкіх, рацкіх настроіў паасобных калгасаў і калгасьнікаў, даючы бязьлітасны адпор спробам правых апартуністаў сарваць збор і загатоўку насенфондаў, трэба неадкладна мабілізаваць сілы партыйных, савецкіх, прафсыпнальных арганізацый, калгасны і саўгасны актыў, каб у максымальна-кароткі тэрмін выканць пастанову партыі і ўраду аб стварэньні насенных калгасных фондаў.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Новыя японскія войскі прыбываюць у Шанхай

Японцам не ўдалося прарваць кітайскіх ліній

ШАНХАЙ, 27-II. Па маючыяся данных прасоўваньне японскага войска за апошні тыдзень ідзе вельмі марудна. Японскага войска, якое ўпоў пры бывае, аказалася недастаткова і 2-ю новым японскім дывізіям, высадка якіх закончваецца абёньня ўночы, выпадае задача выбіць кітайскае войска з Шанхайскага раёну.

Учора барацьба згрупоўвалася ў раёне 3-х вёсак: Сяоцзямао, Шуйдэдун і Чжувентунь, размешчаных паміж вёскамі Цзянван і Мяоцзянцзін. Барацьба працяжалася цэлы дзень. Японскае войска ня раз пераходзіла ў наступ.

Паводле вестак з кітайскіх крыніц, японскаму войску не ўдалося прарваць кітайскія лініі, якія знаходзяцца ў раёне паміж вёскамі Цзянван і Мяоцзянцзін.

На Чапэйскім фронце ня было ніякіх сур'ёзных апэрацый. Толькі часамі варожыя бакі ўжывалі паасобныя выступленьні, якія суправаджаліся артылерыйскім агнём.

Усун зноў бамбардыраваўся з паветра і з мора, у рэзультаце чаго 3 кварталы кітайскіх дамоў зусім разбураны

200 японскіх самалётаў над Шанхаем

ШАНХАЙ. 25 японскіх бомбавозаў і знішчальнікаў зьявіліся над Ханчжоў (галоўны горад правінцыі Чжэцзян, чыгуначны пункт на шляху Шанхай - Ханчжоў). Самалёты бамбардыравалі і разбурылі аэрадром, прывёзшы ў нягоднасьць 5 знаходзячыхся там самалётаў.

Учора японскія самалёты зьявіліся над Лунхуа (чыгуначны пункт, які злучае Шанхай - Ханчжоўскую і Шанхай-Нанкінскую чыгункі) і скінулі некалькі бомбаў, разбурыўшы сялянскія дамы. Шмат сялян забіта і паранена.

Учора Нансян і Чэнжу (станцыі на Шанхай - Нанкінскай чыгунцы) таксама былі бамбардыраваны. Амэрыканская газэта «Ляйнг пост» паведамляе, што японцы маюць у сваім распараджэньні ў Шанхаі 200 ваенных самалётаў.

База для мірных перагавораў рэзка зьмянілася

БЭРЛІН. 26-II. Карэспандэнт «Кэльнішэ Цэйтунг» паведамляе, з Шанхаю: «кітайскія салдаты захоплены ад посьпехаў 19-й кітайскай армі. Яны зараз лічуць сябе непераможнымі. Тысячы рабочых начуюць на вуліцах. Дамы перапоўнены галадуючымі ўцекачамі. Гандаль і вулічны рух прыпынены. Кітай пакуль што хоча міру, ніхто не жадае вайны. Аднак, пасьля гераічнага супраціўленьня кітайскай армі і пасьля заваяваных ёю посьпехаў база для мірных перагавораў, у параўнаньні са становішчам, якое было тры тыдні таму назад, рэзка зьмянілася. Чымся больш, тым усё торш будуць пэрспэктывы гэтых «перагавораў».

Японія ўтойвае страты панесеныя ў наступленьні на Шанхай

НЬЮ-ЁРК. 25-II. У вашынгтонскіх афіцыйных колах цыркулююць чуткі аб тым што японцы ўтойваюць цяжкія страты, панесеныя імі ў Шанхаі. Японскае ваеннае камандваньне робіць грубыя памылкі.

Паведамляюць аб дрэнным маральным стане японскага войска ў процівегласьць добраму маральнаму стану кітайскіх узброеных сіл.

Зазначаюць, што супольны ўдзел у абароне Шанхаю ўзброеных сіл Чан-Кай-Шы і Фын-Юй-Сяна і кантонцаў сьведчыць аб адзінстве Кітаю. Паведамляюць таксама аб зьверскіх адносінах японцаў да мірнага насельніцтва.

„Новы рэвалюцыйны Кітай выйдзе пераможцам

ШАНХАЙ. 26-II. Карэспандэнт Тасс, разам з групай чужаземных карэспандэнтаў, наведаў рад шпіталяў, якія на сьпех наладжаны кітайскай грамадзкасьцю і Чырвоным крыжам. Усяго адкрыта 34 шпіталі. Зьвяртае ўвагу добрая арганізацыя справы, якая вядзецца выключна з дапамогаю добраахвотнікаў і, галоўным чынам, дзяўчат, прайшоўшых кароткатэрміновыя курсы. Урачы, скардзяцца на труднасьці з забясьпечаньнем мэдыкамэнтамі, сьцьвярджаюць, што незадоўга да японскіх падзей японцы закупілі ў Шанхаі вялізарныя запасы мэдыкамэнтаў і зараз кітайцам прыходзіцца выпісваць мэдыкамэнты з іншых гарадоў.

У некаторых шпіталях доктары гавораць аб тым, што японцы карыстаюцца кулямі «Дум-дум».

Больніцы перапоўнены. Параненыя з - за адсутнасьці месц ляжаць у калідорах. Вялікі недахоп у ложках. Многія школы ператвораны ў шпіталі. Унівэрсытэцкія інтэрнаты прадаставілі для параненых свае ложкі. Жанчыны па ўсім горадзе шыюць бялізну для салдат.

Зьвяртае на сябе ўвагу баявы настрой параненых салдат 19-й арміі, якія просяць дактароў выпусьціць іх хутчэй са шпіталю. Хворыя салдаты дыктуюць вучням лісты на імя афіцэраў з просьбай забраць са шпіталяў, каб даць магчымасьць прадоўжыць барацьбу. Лісты накроўваюцца таксама і да сваякоў, у якіх параненыя салдаты просяць бліжкіх быць спакойнымі таму, што «яны (салдаты) вакуюць з імпэрыялізмам, барацьба з якім павін на працягвацца да канца».

Сунх - Цзі - Лін (удава Сун-Ят-Сена), якая суправаджала групы карэспандэнтаў, заяўляе, што «новы рэвалюцыйны Кітай, наперакор Нанкіну, які прадоўжвае стаяць на пазіцыі несупраціўленьня — выйдзе пераможцам з гэтай барацьбы, якая будзе весьцся доўгія тыдні».

Тысячы ўцекачоў, беспрацоўных начуюць на вуліцы

ШАНХАЙ, 26-II. Газэта «Шанхай Таймса» заяўляе, што, калі на працягу бліжайшых дзён ня будзе што-небудзь зроблена для аказаньня дапамогі пацярпеўшым, дык узьнікнуць сур'ёзныя хваляваньні сярод тысяч беспрацоўных, галадаючых рабочых і ўцекачоў. Вялізарныя масы людзей выкінуты на вуліцу і прадстаўлены самім сабе. Аднавіць работу фабрык у раёне Хонькю немагчыма, бо рабочыя адмаўляюцца вярнуцца і нават увайсьці ў раён Хонькю да таго часу, пакуль там знаходзіцца японскае войска. Муніцыпальны савет сэтльмэнта спрабуе пераканаць гандляроў і купцоў аднавіць сваю дзейнасьць. Аднак апошнія адмаўляюцца.

Новы транспарт эвакуяваных з Шанхаю

ТОКІО, 27-II. Учора ў Нагасакі прыбыло 1.174 японцы з Шанхаю. У бліжэйшыя дні пасьледуюць новыя транспарты эвакуяваных. Па ацэнцы шанхайскіх крыніц спачатку шанхайскіх палёў з Кітаю эвакуявана 15000 японскіх рэзыдэнтаў, у тым ліку 11.000 з Шанхаю, г. ё. палова японскай калёніі ў Шанхаі.

Зьверствы японскай ваеншчыны ня спыняюцца

БЭРЛІН, 26-II. Газэта «Вольт Ам Абэнд» перадае падробнасьці зьверстваў, учыненых японскім войскам у Шанхаі і ў Манчжуры.

Некалькі дзён таму назад в Усуну прыбыў вялікі грузавік, пад сьцягам «чырвонага крыжу». Грузавік быў пагружаны шматлікімі маленькімі трунамі. З гэтых трунаў тырчэлі канцовасьці дзіцячых трупаў.

Паводле слоў газэты ня рэдкае зьявішча—зґвалтаваньне кітайскіх жанчын японскімі маракамі.

„Блёкада Японіі перастала быць акадэмічным пытаньнем"

ТОКІО, 26-II. Паводле паведамленьня газэты «Ніцы-Ніцы» міністэрства чужаземных спраў зазначае на тое, што пытаньне аб эканамічнай блёкадзе Японіі «фактычна перастала быць акадэмічным пытаньнем».

Ёсьць небясьпека, што амэрыканскія фірмы спыняць фрахтоўку (наём) японскіх суднаў і наогул адмовяцца ад карыстаньня японскімі грузавымі суднамі. У міністэрстве чужаземных спраў спадзяюцца, аднак, што ПАЗІФ адкрыта не абвесьціць блёкаду.

Гераічны прыклад докераў Дзюнкерхена—падхоплен рэвалюцыйнымі докерамі Францыі

ПАРЫЖ. 26-II. Апублікавана рэзалюцыя прынятая на апошнім паседжаньні выканаўчага бюро Усеагульнай унітарнай канфэдэрацыі працы, на конт падзей на Далёкім Усходзе: УУКП заклікае пралетарыят Францыі да рашучай барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны і на абарону СССР і кітайскіх саветаў. Усеагульная ўнітарная канфэдэрацыя працы заклікае ўнітарныя прафсаюзы не дапускаюць вырабу і адсылкі ваенных матар'ялаў ў Японію і патрабаваць адкліканьня французскіх ваенных і морскіх сіл з усіх кітайскіх партоў і з Інда-кітаю.

Выказнаўчае бюро УУКП зазначае на гераічны прыклад докераў Дзюнкерхена, абвесьцівшых 4 лютага забастоўку і адмовіўшыхся грузіць ваеннае знарадзьдзе прызначанае для Японіі.

У дырэктыве ўказваецца на неабходнасьць, пры разгортваньні масавай работы, асаблівую ўвагу аддаваць прадпрыемствам, вытвараючым ваенныя матар'ялы, чыгункам і партом. Таксама неабходна ўзмацніць агітацыйную работу сярод маладых рабочых і беспрацоўных.

„Нэрвовасьць" у Румыніі

ВЕНА, 26-II. Паводле паведамленьня з Бухарэсту, румынскія газэты падаюць весткі аб пануючай у краіне «нэрвовасьці» ў рэзультаце чутак аб тым, што на жэнэўскай канфэрэнцыі па разбраеньні можа ўзьнікнуць пытаньне аб правядзеньні плебісцыту Бэсарабіі і аб перагляде мірных дагавораў.

Буржуазная прэса патрабуе ад ураду, каб ён супакоіў грамадзкасьць.

Газэты заяўляюць, што ў краіне распаўсюджваюцца «фантастычныя трывожныя чуткі адносна зьнешнепалітычнага становішча».

Як паведамляюць з Кішынёва, губарнатар Барбанеску забараніў выходзячым на рускай мове ў Кішынёве газэтам, друкаваць і камэнтыраваць чуткі, зьвязаныя з бэсарабскім пытаньнем.

Нарастае абурэньне супроць катаў-забойцаў

ПРАГА, 25-II. Хваля пратэстаў супроць крывавай бойні ў Турыа Пасіна працягваецца. З усіх частак краіны паведамляюць, аб дэманстрацыях і за бастоўных пратэсту. Учора паліцыя за бараніла арганізаваныя міжрабпомам у Празе сходы па аказаньні дапамогі Закарпацкай Украіне. Сабраўшыяся рабочыя масы запоўнілі праскія вуліцы і бурна пратэставалі супроць паліцэйскага тэрору. Адбылася сутычка з паліцыяй, у часе якой трое паліцэйскіх былі паранены. 15 рабочых арыштаваны і аддаюцца суду.

ПРАГА, 25-II. Камдэпутат, тав. Капецкі выступіў у парляманцкай камісіі з пратэстам супроць белага тэрору на Закарпацкай Украіне. Нясупынна перабіваемы старшынёй камісіі тав. Капецкі даў абураючы малюнак галечы і голаду закарпацкіх украінцаў, заяўляючы, што закарпацкая ўлада на ўсе заклікі аб дапамозе, якія ідуць з гэтай краіны, адказвае не прывозам хлеба, а прывозам жандараў.

Пра ход загатовак насеньня

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Выслухаўшы інфармацыю Народнага Камісара Земляробства тав. Рачыцкага аб ходзе загатоўкі і засыпкі насеньня, у прыватнасьці гародных культур і насеньня траў, Савет Народных Камісараў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Адзначыць абсалютную слабасьць работы загатоўчых арганізацый Белкалгаснасенсаюзу, Белхлебжывёлсаюзу, Ільноканапляводсаюзу і Белнаапсаюзу ў загатоўцы насеньня, а таксама Магілеўскага, Чэрыкаўскага, Лельчыцкага, Жлобінскага, Веткаўскага, Гарадоцкага і Вушацкага раённых выканаўчых камітэтаў, якія амаль што зусім не разгарнулі работы па загатоўцы і засыпцы насеньня, што тлумачыцца недаацэнкаю з боку гэтых арганізацый важнасьці мабілізацыі на сенных рэсурсаў.

2. Зьвярнуць увагу кіраўнікоў Белкалгаснасенсаюзу, Ільноканапляводсаюзу, Белхлебжывёлсаюзу, Белнаапсаюзу, старшынь паказаных у п. 1 гэтай пастановы райвыканкомаў і загадчыкаў РайЗА гэтых раёнаў на незадавальняючую работу па загатоўцы і засыпцы насеньня і прапанаваць ім у бліжэйшыя дні дабіцца належнага пералому і праз 5 дзён паведаміць ОНК аб ходзе загатовак і засыпкі насеньня.

3. За недачу зьвестак з пачатку кампаніі аб ходзе загатовак насеньня старшыням Клічаўскага і Нараўлянскага раённых выканаўчых камітэтаў абвясьціць вымову, а загадчыкаў раённых зямельных аддзелаў гэтых раёнаў зьняць з працы.

4. Яшчэ раз пацьвердзіць усім РВК, што сыстэма спажывецкай кааперацыі бязумоўна ўдзельнічае ў загатоўках насеньня наогул і ў першую чаргу ў загатоўцы насеньня гародніны для забясьпечаньня сваіх прыгарадных гаспадарак. Адзначаючы наяўнасьць фактаў недапуску да загатовак насеньня сыстэмы спажывецкай кааперацыі, папярэдзіць старшынь РВК аб тым, што за забарону загатоўкі насеньня сыстэме Белкаапсаюзу ва наватыя будуць прыцягвацца да адказнасьці.

6. Забараніць усім раённым выканаўчым камітэтам устанаўляць якія-б ня было абмяжаваньні ў перакідцы загатоўленага насеньня з раёну ў раён без узгадненьня ў кожным асобным выпадку з Народным Камісарыятам Земляробства.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
С. КАНДЫБОВІЧ.
Менск, 25 лютага 1932 г.

ПА СССР

Фінляндская эканамічная дэлегацыі ў т. Розенгольца

25-га лютага Народны камісар зьнешняга гандлю тав. Розенгольц прыняў прыбыўшую ў Маскву фінляндскую эканамічную дэлегацыю. У часе гутаркі бакі абмяняліся меркаваньнямі аб магчымасьці ажыўленьня эканамічных сувязей паміж абедзьма краінамі.

Радыё—масам

4.500 радыё-пунктаў у БССР

МАСКВА. Наркамсувязі Саюзу ў 1932 г. прадпрыемствы вугальнай, нафтавай і тарфянай прамысловасьці. Усяго будзе ўстаноўлена 38.000 радыёпунктаў. З іх па РСФСР—19.000, па Украіне—10.700, па Беларусі—1.000, па Закаўказьзі—7.000, па Узбэкістану—300.

У 1932 годзе будзе праведзена шырокая радыёфікацыя лесазагатовак. Усяго будзе ўстаноўлена на лесазагатоўках 28.000 радыёпунктаў. З іх 23.900 радыёпунктаў будзе ўстаноўлена на лесазагатоўках РСФСР, 1.500 на лесазагатоўках Украіны, 2.000 на леса загатоўках Беларусі і 600 на лесазагатоўках ЗСР.

У 1932 годзе на прадпрыемствах мэталюргічнай і машынабудаўнічай прамысловасьці Саюзу будзе ўстаноўлена 82.000 радыёпунктаў. З іх па РСФСР—60 тысяч, па Украіне—16.000, па Беларусі—1.500, па Закаўказьзі—2.000, па Узбэкістану—1.500.

Да 50-годзьдзя сьмерці Карла Маркса

МАСКВА. 4 сакавіка 1932 г. скончыцца 50 год з дню сьмерці Карла Маркса. У сувязі з гэтым нарада ўсіх інстытутаў і таварыстваў, якія ўваходзяць у сыстэму камакадэміі пастанавіла выдаць спэцыяльны зборнік. Кожны інстытут, у сваю чаргу выдае спэцыяльную навукова-дасьледчую работу ў сваёй галіне і папулярную брашуру. Мяркуецца зборнік камакадэміі і рад папулярных брашур перавесьці на чужаземныя мовы.

Вынаходзтва т. Грыгарана

МАСКВА, 23. Тыфліскі рабочы шэйнік Грыгаран вынайшоў машыну для разьметкі насьцілу мадэлі, якая замяняе працу 75 рабочых. Машына Грыгарана прасьцей, дзешавей і лепш за заграніччную.

За бальшавіцкія тэмпы аўладаньня навукай і тэхнікай

МАСКВА. У мэтах палепшаньня работы навукова-тэхнічных выдавецтваў, падвышэньня якасьці выдаваемай літаратуры і разгортваньня закліку ўдарнікаў у тэх. літаратуру, УсеЦСПС арганізуе 25-га лютага месячнік агляду масавай тэхнічнай літаратуры і рабочага аўтарства. Задача агляду—праверка выкананьня рашэньняў ЦК УсеКП(б) ад 25-га мая і 6-га жніўня 1931 году, рашэньняў НК РСІ аб тэх. літаратуры і рабоце з рабочымі-аўтарамі, праверка і палепшаньне сыстэмы распаўсюджваньня тэх. кніжкі і набліжэньне кнігагандлю да фабрык, заводаў і новапабудоў.

Агляд выявіць становішча работы па выданьні тэхнічнай літаратуры на мовах нацыянальнасьцяй СССР. Для практычнага правядзеньня агляду ЦК прафсаюзаў вылучаюць брыгады з прадстаўнікоў навукова-дасьледчых інстытутаў, тэх. арганізацый навукова-тэхнічных таварыстваў, актыву прадпрыемстваў і г. д.

Культармейскі ўнівэрсытэт

КІЕЎ, 23. У Кіеве адкрыты першы на УССР культармейскі ўнівэрсытэт, які будзе рыхтаваць рабочых—перадавых байцоў на культурным фронце. Унівэрсытэт мае 6 факультэтаў, у тым ліку факультэт лікбезу, факультэт рабочай адукацыі, тэхнічнай адукацыі і інш.

БЛІСКУЧАЯ ПЕРАМОГА САВЕЦКАЙ ТЭХНІКІ

ГОРЛАЎКА. На імя генэральнага сакратара ЦК КП(б)У т. Касіёра тры кутнік шахты № 1 паслаў наступную тэлеграму:

«Намаганьнямі рабочых і інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу шахты № 1 упяршыню ў Данбасе на пласьце «Мазурка № 11 прабурана вэнтыляцыйная бурка даўжынёй у 73 мэтра на працягу 8 гадз. 36 мін. турбарубам сыстэмы Капелюшнікава. Ужываньне турбабура, які пасьпяхова скарыстоўваец па ў нафтавай прамысловасьці адкрывае новыя вялізарныя пэрспэктывы ў бальшавіцкай мэханізацыі Данбасу».

Зараз на шахце № 1 ідзе падрыхтоўка да шырокага скарыстаньня турбабура на падрыхтоўчых і эксплёатацыйных работах. Створана спэцыяльнае бюро. Аб'яднаньне «Вугаль» адпусьціла на работы 300 тыс. руб. Мяркуецца праходзіць ствол пры дапамозе турбабура на шахце «Камсамолец».

Пераключыць здабыткі навукі

з інстытутаў, дасьледчых станцый у саўгасы, МТС і калгасы

Адкрыты ліст сакратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча ўсяму цэнтральнаму і раённаму друку БССР

5-га сакавіка склікаецца ўсебеларускі агразоатэхнічны зьезд. На зьезд ускладаецца адказьнейшая задача—мабілізаваць аграспэцыялістаў на поўнае ажыцьцяўленьне пастаноў партыі аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, мабілізаваць масы на барацьбу за высокі ўраджай, за высокую таварнасьць гаспадарак, намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па ўкараненьні агра і зоатэхнікі ў калгасах і саўгасах на 1932 год.

Таму, як цэнтральны, так і раённы друк павінны максымальна скарыстаць гэты тэрмін для падрыхтоўкі работы папулярызацыі пытаньняў, якія будуць вырашацца зьездам, для пастаноўкі на старонках друку цэлага раду праблем, якія маюць актуальнае значэньне ва ўмовах БССР у барацьбе за падвышэньне ўраджайнасьці, мабілізуючы найшырэйшыя масы на выкананьне і старычных пастаноў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

Масы, як мага хутчэй павінны аўладаць агратэхнікай, перанесьці адабыткі навукі з інстытутаў і дасьледчых станцый у калгасы і саўгасы, даць папулярную агратэхнічную літаратуру; перайсьці ад слоў аб агратэхніцы да канкрэтных баявых дзеньняў па ўжываньні агратэхнікі — вось выходны пункт для друку ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце да зьезду.

Канкрэтна неабходна правесьці наступнае:

1. Зьмясьціць на старонках друку рад артыкулаў: аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў (упор на брыгаду, зьдзельшчыну, улік і кантроль на вылучэньне і выхаваньне калгаснага актыву), аб тыповых севазваротах па асобных спэцыялізаваных гаспадарках, хімізацыі глебы (асабліва ў вапнаваньні), сэлекцыі, тэрмінах сяўбы, захаваньні азімых ад выкананьня і выпраўваньня, аб узьняцьці ўраджайнасьці тэхнічных культур, стварэньні кармовай базы, барацьбе з эпізоотыяй, мэханізацыі сельскай гаспадаркі і г.д.

2. Арганізаваць на старонках друку выступленьні (як калектыўныя, так і не калектыўныя) аграспэцыялістаў інстытутаў і дасьледчых станцый, зямельна - калгасных органаў, якія-б паставілі перад зьездам рад як праблемных, так і канкрэтных пытаньняў па паасобных галінах сельскай гаспадаркі: арганізацыі працы, мэханізацыі і электрыфікацыі, узьняцьці ўраджайнасьці тэхнічных культур, разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі і інш.

3. Арганізаваць выступленьні жывёлагадоўчых, лёнаводных, садова - гародных калгасаў і саўгасаў з патрабаваньнямі і канкрэтнымі прапановамі да агратэхнічнага зьезду. З сёньняшняга дню штодзённа асьвятляць вопыты лепшых саўгасаў і калгасаў у барацьбе за падвышэньне ўраджайнасьці, узьняцьці прадукцыйнасьці жывёлы, аўладаньне агразоотэхнікай.

4. На старонках нізавога саўгаснага і калгаснага друку, а таксама і цэнтральных газэт неадкладна распачаць збор рацыяналізатарскіх прапаноў ад калгасьнікаў - ударнікаў, рабочых саўгасаў, брыгадзіраў, агранома, зоатэхнікаў, як лепш ва ўмовах таго ці іншага калгасу і саўгасу ўжыць агратэхнічныя мерапрыемствы ў часе веснавой сяўбы ў мэтах атрыманьня большай - ураджайнасьці. Дабіцца, каб у кожным калгасе і саўгасе была кніга агратэхнічных прапаноў. Сачыць за тым, каб кожная каштоўная прапанова абгаварвалася на вытворчай нарадзе, а потым ажыцьцяўлялася ў практычнай рабоце.

5. У адзнаку зьезду мабілізаваць найшырэйшыя масы калгасьнікаў і рабочых саўгасаў на хутчэйшую ссыпку насенных фондаў, ачыстку і пратручваньне насеньня, правядзеньне гатункова абмену насеньня, вывазку са станцыі мінэральнага ўгнаеньня, вывазку гною на палі, выпрацоўку севазваротаў, падрыхтоўку і захаваньне кормоў да вясны і г. д.

6. Ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце да зьезду падкрэсьліць вялізарную арганізуючую ролю МТС, як арганізатараў калгаснай вытворчасьці і вялікіх фактараў па пераўтварэньні калгасных мас, ператвараючы МТС у сапраўдных арганізатараў калгаснай вытворчасьці, барацьбы за высокі ўраджай, узьняцьця прадукцыйнасьці калгаснай працы. Задача партыйных арганізацый — «узмацніць штодзённую дапамогу машына - трактарным станцыям ў асабліваўсьці ў справе ўмацаваньня кадраў і ўзмацніць кіраўніцтва ва ўсёй гаспадарчай рабоце МТС» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага 1932 г.).

7. Разгарнуць паміж нізавым і раённым друкам сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне падрыхтоўчай работы да агратэхнічнага зьезду і асьвятленьне ходу работы самога зьезду. Паказальнікам першынства павінны зьяўляцца: лепшыя прапановы да зьезду, поўнае ажыцьцяўленьне агратэхнічных мерапрыемстваў у калгасах і саўгасах у часе веснавой сяўбы.

8. Цэнтральнаму друку больш поўна асьвятляць работу самога зьезду. Белта неадкладна распрацаваць план асьвятленьня работ зьезду ў раённым друку, выходзячы з дыфэрэнцыяванага па раўніцтва: жывёлагадоўчымі, ільнавымі, плодагароднымі калгасамі.

9. Уся падрыхтоўчая работа павінна быць пранізана рэалізацыяй пастаноў ЦК УсеКП(б) «аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў», рэалізацыі умоў тав. Сталіна, рэалізацыі пастаноў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б, выходзячы з асаблівасьцяй асобных галін сельска-гаспадарчай вытворчасьці, высоўваньні і выхаваньні калгаснага актыву з лепшых ударнікаў калгаснай вытворчасьці, удзельнікаў сацыялістычнага спаборніцтва.

10. Абавязаем партарганізацыі неадкладна наладзіць систэматычны кантроль і праверку ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце да зьезду па ўсіх галінах работы.

Сакратар ЦК КП(б)Б Шаранговіч

Кроў--золата

Заводы Школа і Шнэйдэр-Крэзо зарабляюць мільёны за пастаўку зброі японцам (з газэт).

ДЭКАДНІК ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ ЛІКБЕЗУ

Не спадзяваньне на самацёк,

а ўпартая, штодзённая барацьба забясьпечыць ператварэньне БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці

У Дрысенскім і Рагачэўскім раёнах ліквідацыя няпісьменнасьці прадастаўлена самацёку. Мясцовыя арганізацыі гэтых раёнаў не скарысталі дэкаднік генэральнай праверкі для мабілізацыі працоўных мас на барацьбу за суцэльную пісьменнасьць. Так далей продоўжвацца ня можа. Партарганізацыі Дрысенскага і Рагачэўскага раёнаў—ваша задача—разгарнуць на баявому штурм на ліквідацыі прарываў на фронце барацьбы за ператварэньне раёнаў у суцэльна-пісьменныя да 1 мая г. г.

50 проц. няпісьменных не ахоплены вучобай у Дрысенскім раёне

Ліквідацыя няпісьменнасьці на Дрысенскім раёне не стаіць у цэнтры ўвагі мясцовых арганізацый. Рад калгасаў раёну ня маюць лікпунктаў, а там, дзе яны ёсьць, працуюць слаба:—недастаткова ахоплены вучобай калгасьнікі і аднаасобнікі, зусім слабае наведваньне. Лікпункты не забясьпечаны падручнікамі і належным абсталяваньнем. Ёсьць выпадкі, калі ў янасьці падручнікаў на лікпункце ўжываюцца нацдэмаўскія кніжкі выданьня 1928 г.

Па Вальнецкім, Прудзінкаўскім і Барковіцкім сельсаветах ахоп няпісьменных і малапісьменных вучобай дасягае толькі 50 проц. у той час, як паводле вестак райінспэктуры, па гэтых сельсаветах ахоплена вучобай 80 проц.

Па Прудзінкаўскім сельсавеце зусім не працуюць лікпункты пры калгасах «Камунар», «Новы строй», «Згода», па Вальнецкім сельсавеце пры калгасе «Камінтэрн».

Такое становішча на фронце ліквбезу атрымалася толькі таму, што з боку мясцовых партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый гэтаму пытаньню ня было аддана належнай увагі. На прозьдыумах сельсаветаў амаль не заслухоўваліся справаздачы метадыстаў-ліквідатараў.

Дрысенскі РВК не зьвярнуў належнай увагі на ліквідацыю няпісьменнасьці. Досыць сказаць, што на прозьдыуме РВК ніводнага разу не заслухоўваліся справаздачы сельсаветаў аб становішчы ліквідацыі няпісьменнасьці. На параду, скліканую брыгадай па пытаньні ліквбезу, прадстаўнікі РВК, ня гледзячы на запрашэньне, не зьявіліся.

Спаборніцтва і ўдарніцтва па лікпунктах раёну зусім не разгорнута. Т-ва «П. Н.» і ячэек «П. Н.» па раёне няма. Пазыка «за суцэльную пісьменнасьць БССР» не распаўсюджана.

Зразумела, пры такіх адносінах да ліквбезу, пастанова партыі і ўраду аб заканчэньні ліквідацыі няпісьменнасьці да 1 мая па Дрысенскім раёне выканана ня будзе. За час дэкадніка праверкі раённыя арганізацыі павінны дамагчыся пералому і ўсіх няпісьменных ахапіць навучаньнем.

Брыгада Кузьмічоў, Башчанаў.

У Рагачэўшчыне дэкаднік праверкі ня даў яшчэ зруху

У Рагачоўскім раёне дырэктыва партыі і ўраду аб ператварэньні БССР да 1-га мая 1932 г. у краіну суцэльнай пісьменнасьці не знайшла праламленьня ў практычнай рабоце некаторых мясцовых арганізацый. Рад устаноў і арганізацый, як райкалгасаюз, райспажыўсаюз і райпрафсавет лічаць, што справа ліквбезу—справа толькі аддзелу нарасьветы і настаўніцтва.

Некаторыя сельсаветы раёну таксама не зьвярнулі належнай ўвагі на ліквідацыю няпісьменнасьці. Казяўскі сельсавет, які зьяўляецца сельсаветам суцэльнай калектывізацыі, зусім не змагаецца за суцэльную пісьменнасьць.

У самым Рагачэве няма сталых зьвестак аб колькасьці няпісьменных і малапісьменных, як напрыклад, няпісьменныя — рабочыя мясцовай МТС, зусім ня ўсягры на вучот. Лікпункт саюзу мэдсанпрацы займаўся паўтара месяца і разваліўся. На час зімовых канікул тэхнікума ўсе лікпункты гораду спынілі сваю работу, спынена было і індывідуальнае навучаньне, якое вялі студэнты тэхнікуму.

Паводле даных аддзелу асьветы, па раёне і горадзе налічваецца 5886 няпісьменных, з якіх неахоплена навучаньнем нібы толькі 329 чал. Апошняя лічба, бязумоўна, неправільная,—па-за вучобай засталося значна больш.

Дэкаднік генэральнай праверкі барацьбы за суцэльную пісьменнасьць яшчэ не зрабіў пералому ў раёне. Пралетарская грамадзкасьць не мабілізавана на рэалізацыю дырэктыў ЦК КП(б)Б. Ліквідацыя няпісьменнасьці ў Рагачэўскім раёне прадстаўлена самацёку. Так надалей працявацца ня можа. Усе сілы і сродкі трэба кінуць на ліквідацыю прарываў. Дэкаднік праверкі раённыя арганізацыі павінны ператварыць у дэкаднік штурму, мабілізаваўшы ўсю пралетарскую грамадзкасьць раёну на барацьбу за суцэльную пісьменнасьць.

М. Паляўцоў.

„З ліквбезам яшчэ пасьпеем"

—разважаюць у Ісэрнскім сельсавеце

У Ісэрнскім сельсавеце Слуцкага раёну пытаньне барацьбы за суцэльную пісьменнасьць—забытая справа.

У выніку, работа лікпунктаў і школ малапісьменных стаіць далёка не на належнай вышыні. Так, у Працавіцкім школьным раёне наведваньне лікпунктаў складае ня больш 19-20 пр., а школ малапісьменных—30 проц. У самім цэнтры сельсавету — у в. Ісэрна наведваюць лікпункт толькі 25 проц. няпісьменных. Такі-ж малюнак у в. Катох і іншых пунктах сельсавету.

У чым-жа прычыны такіх прарываў?

Справа ў тым, што партыйныя ячэйкі сельсавету ня толькі не мабілізавалі калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкае сялянства на барацьбу за суцэльную пісьменнасьць, а ёсьць факты яўна апартуністычных разважаньняў паасобных партыйцаў. Так, сакратар партячэйкі калгасу «Случ № 2» тав. Ждан на пленуме сельсавету заявіў:

— З ліквідацыяй няпісьменнасьці пасьпеем.

Гэтаму апартуністычнаму разважаньню ніхто ня даў адпору і настроі «яшчэ пасьпеем» пануюць сярод асобных работнікаў сельсавету і мясцовых грамадзкіх арганізацый.

КК-РСІ,—слова за тэзай. Вінаватых у зрыве ліквбезу—да адказнасьці, а ў сіх няпісьменных—за вучобу. М.

Скурзаводам-сыравіну

Прыкрыць кадушніцкія „майстэрні". Аддаць кадушнікаў пралетарскаму суду. Спыніць драпежнае зьнішчэньне каштоўнай скурсыравіны: асмальваньне і ашпарваньне сьвіней. Крывую загатовак узьняць уверх!

700.000—рэальная лічба

З году ў год пашыраецца скураная прамысловасьць. У БССР працуюць скураной прамысловасьці ў чацьвёртым заключным годзе навялічваецца да 62 млн. руб., г. зн. на 26 проц. вышэй прадугледжанага першай пяцігодкай.

У агульным фондзе сыравіннай базы вялікае значэньне мае скура сьвіней, якая павінна на 50 проц замяніць скуру рагатай жывёлы. Таму, барацьба за сьвіную скуру зьяўляецца зараз цэнтральнай задачай пры вырашэньні пытаньняў сыравіннай базы для прамысловасьці.

Звыш 2 мільёнаў сьвіных скур у БССР гінула штогод, у той час як гэтая скура з посьпехам магла-б ісьці на вырабы скураной прамысловасьці.

Выкананьне пляну па загатоўках скурсыравіны па БССР паводле вестак за 20 дзён лютага 32 г. ідзе слаба. Ёсьць такія раённыя загатоўчыя сеткі, якія даюць вельмі нізкія паказьнікі выкананьня пляну. Пры гэтым трэба ўлічыць, што першы квартал зьяўляецца больш спрыяючым у сэнсе загатоўкі і павінен даць поўнае выкананьне пляну.

Так, Магілеўскі раён выканаў плян па буйнай скурсыравіне на 54,7 проц. Менскі раён—на 43,4 проц., Аршанскі раён—на 52,6 проц. Па дробнай скурсыравіне Аршанская сетка выканала плян на 39,6 проц., Магілеўская—на 40 проц., Гомельская—на 40,8 проц. Па загатоўках сьвіных скур Гомельская сетка выканала плян на 27,6 пр. Мазырская—на 45,3 проц., Магілеўская—на 51,4 проц.

Яшчэ горш з загатоўкай сабачых скур. Невыкананьне пляну наглядаецца па ўсіх бяз выключэньня сетках. Так, па БССР загатоўка сабачых скур дае толькі 21,4 проц. за першыя дзьве дэкады лютага.

Калі прасачыць як выканана заданьне за студзень 32 г. па буйных і дробных скурах, а таксама па сьвіных, дык мы бачым, што па ўсіх паказьніках адстаюць Бабруйская загатоўчая сетка, Слуцкая, Смалявіцкая, Кармянская і Лельчыцкая. У гэтых раёнах сыстэматычна недавыконваецца плян. Тлумачыцца гэта тым, што ў гэтых раёнах не разгорнута належная работа па ўзмацненьні тэмпаў загатовак, што раённыя, партыйныя, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі не надалі загатоўкам належнай увагі і значэньня.

З другога боку мы можам адзначыць ударную работу некаторых загатаўчэльных сетак як Полацкая і Лепельская. Студзеньскі плян па Полацкае выкананы на 269,8 проц.

Гэтыя посьпехі гавораць за тое, што плян рэальны, што яго можна выканаць, што адстаючыя раёны ня могуць нічым апраўдаць сваю бязьдзейнасьць і нежаданьне разгарнуць шырокай работы вакол загатовак.

Асноўная маса кальтаснікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў зразумелі важнасьць стварэньня сыравіннай базы для прамысловасьці і вядуць рашучую барацьбу з кулацкай агітацыяй за ашпарваньне і асмальваньне сьвіней.

БССР высунула сустрэчны плян па загатоўцы сьвіных скур, які павялічвае яго на 100 проц. Выкананьне гэтага пляну—справа гонару раённых партыйных, савецкіх і загатоўчых арганізацый. Шырокай масавай работай, разгортваньнем сацспаборніцтва паміж паасобнымі раёнамі і сельсаветамі, мабілізацыяй калгаснага і вясковага актыву на барацьбу за сьвіную скуру—гэты сустрэчны павінен быць выкананы.

Сёньня наша газэта зьмяшчае ліст намесьніка старшыні СНК БССР тав. БЭНЭКА, у якім ён з усёй катэгарычнасьцю падкрэсьлівае неабходнасьць узмацненьня загатовак скурсыравіны і барацьбы з кулацкай агітацыяй, якая накіравана на зрыў пляну скураной прамысловасьці.

Кулакі часам распаўсюджваюць чуткі аб тым, што апошняя пастанова СНК СССР ад 29 студзеня дазваляе асмальваньне і ашпарваньне сьвіней. Па гэтай кулацкай хлусьні трэба моцна ўдарыць. Пастанова ўрада, якая гаворыць аб зьніманьні сьвіных скур на ламу, ні ў якім разе ня можа быць расцэнена як адмена абавязковай пастановы аб зьніманьні сьвіных скур.

700 тысяч сьвіных скур у чацьвёртым заключным па БССР—рэальная лічба. Яе можна і трэба выканаць.

Праверыць выкананьне дырэктыў ураду

За подпісам намесьніка старшыні СНК БССР т. Бэнэка ўсім старшыням РВКасланы ліст наступнага зьместу:

Выкананьне пляну загатовак скурсыравіны за першы квартал бягучага году па БССР на 20 лютага вызначаецца ў наступным:

Па буйных скурах—40,8 проц.—41,8, па дробных—40,0, сьвіных—65,5, сабачых—18,0.

Такім чынам, тэмпы скуразагатовак не забясьпечваюць выкананьня пляну і кварталу б-г. і ствараюць рэальную пагрозу ў забясьпячэньні скураной прамысловасьці сыравінай.

Пастановы СНК СССР ад 13-I-31 г. пра мерапрыемствы па забясьпечаньні сыравінай скурапрамысловасьці і ЦВК і СНК БССР ад 5-III і 25-VIII 31 г. на мясцох праводзяцца ў жыцьцё недастаткова рашуча.

У шэрагу раёнаў затрымка і саматужная пераапрацоўка скурсыравіны носіць яшчэ масавы характар. Пашырыліся самаснабжэнчаскія тэндэнцыі ў саўгасах і калгасах і пераапрацоўка сыравіны для ўласнага спажываньня.

Аб выкрытых нелегальных прадпрыемствах маюцца паведамленьні з шэрагу раёнаў (Гарадоцкага, Веткаўскага і інш). Таксама аб палучэньні скурсыравіны і асяданьне апошняй на вёсны маюцца весткі па Веткаўскім, Хойніцкім, Быхаўскім і інш. раёнах.

Наглядаецца нават позаваньне дэфіцытнай скурсыравіны ў некаторых раёнах (рэжуць на лапці, выкручваюць на гужы і г. д.).

Замест рашучай барацьбы з нелегальнай пераапрацоўкай і спажывецкімі настроямі на мясцох праяўляюцца прымірэнчыя адносіны. Напрыклад, у Менску праўленьне прыгаральнага калгасу імя Сталіна, дзе знойдзена было ў пераапрацоўцы 11 буйных скур, было судом апраўдана і толькі пераасрадны вінаўнік, які перарабляў сыравіну, быў ашпрафаваны на 20 руб.

У адносінах парушэньняў пастановы аб зьёмцы сьвіных скур ад забіваемых сьвіней у некаторых раёнах наглядаюцца недапушчальныя зьявішчы з боку асобных працаўнікоў, у тым ліку кіруючага складу (старшыні сельсаветаў, сельпо, калгасаў, настаўніцтва і інш.), якія замест прыкладу, для астатняга насельніцтва, самі парушаюць пастановы ўраду.

Каб забясьпечыць выкананьне пляну 4 заключнага году пяцігодкі і павялічэньне сыравінных расурсаў скураной прамысловасьці прапаную:

1. Праверыць выкананьне на мясцох пастановы СНК СССР ад 13-I-31 г. і інструкцыі ВСНГВ і НКСнабу БССР, выдадзеных у разьвіцьцё гэтай пастановы (апубл. у газ. «Савецкая Беларусь» ад 20-VI-31 г.) і пастанову ЦВК і СНК БССР ад 5-III і 25-VIII 31 г., дабіўшыся поўнага зьнішчэньня нелегальнай пераапрацоўкі скурсыравіны, здачы ўсёй маючайся сыравіны ў саўгасах і калгасах, ліквідаваньня асмальваньня і ашпарваньня сьвіных тушэ.

2. Абавязаць райпракуратуру і судовыя органы ў хуткім часе разглядзець справы аб нелегальнай пераапрацоўцы і парушэньнях у частцы зьёмкі сьвіных скур.

3. Даручыць органам міліцыі пасіліць нагляд за поўным правядзеньнем у жыцьцё пастаноў ураду ў частцы зьнішчэньня нелегальнай пераапрацоўкі скурсыравіны і здачы дзяржаўным і кааператыўным загатоўчым арганізацыям, а таксама ў адносінах зьёмкі сьвіных скур, прымяняючы да асоб і ўстаноў, якія зьнішчаюць скурсыравіну, суровыя меры ўзьдзейнічаньня.

Тут патрэбна ўмяшаньне пракурора

За апошні час па Слуцкім раёне наглядаюцца масавыя выпадкі парушэньня пастаноў ураду аб забароне ашпарваньня і асмальваньня сьвіных скур. Так, у саўгасе, «Івань» амаль усе рабочыя асмалілі сваіх сьвіней. Ні рабфакам, ні парт'ячэйка, ні насьценгазэта не рэагавала на гэтае злачынства.

На гэтым-жа раёне амалілі сьвіней рад адказных працаўнікоў, сярод іх інспэктар райфа Ляўчук, старшыня саюзу харчавікоў Раманчук, упаўнаважны лёндсаюзу Клімаў, агранам калгасу «1 мая» і г. д.

На Урэцкім сельсавеце старшыня сельсавету Ячэвіч і загадчык Урэцкага млыну, член КП(б)Б і актывіст РСІ, таксама парушылі пастанову ўраду.

Пабач з гэтымі фактамі зьнішчэньня скур у Слуцкім раёне наглядаецца драпежнае псаваньне ўжо зьнятых сьвіных скур. Зьёмшчык сьвіных скур тав. Тарасевіч а вёсцы Цірасполь, паведаміў аб тым, што зьнятыя скуры рэжуцца некаторымі калгасьнікамі для падшыўкі пад лапці.

Адміністрацыйныя органы вядуць слабую барацьбу з парушэньнямі пастаноў ураду. Ня гледзячы на тое, што складзена больш 300 актаў на парушыцеляў, штрафы не спаганяюцца.

Пракуратура павінна зацікавіцца справамі ў Слуцкім раёне.

Ж.

З фронту загатовак

Выкананьне пляну загатовак скурсыравіны першага кварталу 1932 г.

за студзень і 20 дзён лютага

	Буйная скура выкан. у проц.	Дробная скура выканан. у проц.	Сьвіная скура у проц.
Саюзскур. . .	88,0	101,3	146,8
Белжывсаюз . .	36,2	19,5	44,6
Белкаасаюз . .	68,0	26,6	102,3
Усяго раён. збор.	63,5	43,4	101,2
Саюзмяса .	16,2	23,0	11,9
Разам . . .	40,8	40,0	65,5

Усесаюзны конкурс на лепшую ашчадкасу

МАСКВА. Цэнтральная камісія садзейнічаньня дзяржкрэдыту пры ЦВК СССР пастанавіла правесьці з 1-га сакавіка па 1-га мая ўсесаюзны конкурс на лепшую ашчадкасу.

Асноўныя задачы конкурса: правесьці шырокі грамадзкі агляд работы ашчадкас СССР, выявіць умовы работы паасобных кас і асноўныя недахопы, выявіць лепшыя ашчадкасы і распаўсюдзіць іх дасягненьні па ўсім Саюзе. Рашуча палепшыць абслугоўваньне ашчадкасамі працоўных, забясьпечыць выкананьне ашчадкасамі пляну па мабілізацыі сродкаў насельніцтва ў чацьвертым годзе пяцігодкі.

Кіраваць конкурсам у цэнтры будзе спэцыяльная конкурсная камісія з прадстаўнікоў цэнтральнай камісіі садзейнічаньня пры ЦВК СССР, ЦК ЛКСМ, ЦК саюзу Дзяржбанкаўскіх работнікаў, Галоўнага кіраўніцтва дзяржашчадкас і рэдакцыя газэты «Экономический Вестник».

На прэм'іраваньне лепшых ашчадкас асыгнуецца 400.000 рублёў.

МЕСЯЧНІК ДАПАМОГІ ДАРОЖНАМУ БУДАЎНІЦТВУ

Узьняць тэмпы зімовых дарожных работ

Неадкладна ліквідаваць адставаньне

(Зводка выкананьня асноўных зімовых дарожных работ за першую пяцідзёнку месячніка)

Вывазка каменьня. Атрыманыя зьвесткі за першую пяцідзёнку сьведчаць аб тым, што вывазка каменьня ў радзе месц праходзіць вельмі незадавальняюча: за пяцідзёнку выканана толькі 3,1 проц. месячнага заданьня. Толькі 12 дарбудвучастак выканаў 22,16 проц. месячнага пляну. Астатнія вучасткі выканалі ня больш як 5,14 проц. пляну. 1-шы дарбудвучастак зусім не распачынаў гэтай работы.

Вывазка гравія. Агульны процант выкананьня месячнага пляну вывазкі гравія выкананы ўсяго на 1,29 проц. Самы высокі паказьнік дае 4 вучастак, які выканаў 8,15 проц. месячнага заданьня. 12 вучастак нічога ня вывез, 2 вучастак выканаў 0,31 проц., 9 вучастак выканаў 0,44 проц.

Вывазка пяску і лесаматар'ялаў. За першую пяцідзёнку месячніка выкана на ўсяго 1,22 проц. пляну па вывазцы пяску і 1,23 проц. па вывазцы лесаматар'ялаў.

Па вывазцы пяску асабліва адстаюць 3 дарбудвучастак, які зусім нічога ня вывез, і 1 і 2 вучасткі, якія вывезлі толькі 0,25 проц. заданьня.

Упераадзе ідзе 4 вучастак, які выканаў 4,1 проц. заданьня

4, 10, 11 і 12 вучасткі ня вывезьлі ніводнага кубамэтру лесаматар'ялаў.

7 дарбудвучастак выканаў 17,06 проц. заданьня.

Па земляных работах плян выкананы на 1,05 проц. Адзін толькі 5 дарбудвучастак выканаў плян земляных работ на 13,97 проц. 3, 9 і 10 вучасткі ў гэтай галіне нічога не зрабілі.

***

Зьвесткі аб разгортваньні падрыхтоўчых работ да дарожна-будаўнічага сэзону 1932 г. сьведчаць аб тым, што гэта работа ў радзе месц ідзе надзвычайна марудлівымі тэмпамі, якія пагражаюць сваячасоваму выкананьню пляну ну дарожнага будаўніцтва бягучага году.

Выкананьне 3,1 проц. пляну вывазкі каменьня, 1,29 проц. вывазкі гравія, 1,22 проц. і 1,23 проц. пляну вывазкі пяску і лесаматар'ялаў, выкананьне толькі 10 проц. пляну вывозу падвоз—ганебныя лічбы прарыву.

Рад раённых, партыйных, савецкіх, калгасных і аўтадорўскіх арганізацый і кіраўніцтва значнай колькасьці дарбудвучасткаў апартуністычна недаацэньваюць важнасьці дарожнага будаўніцтва, ня выконваюць дырэктыў ЦК партыі аб разгортваньні месячніка штурму прарываў.

Некаторыя райкітабы ня зьмогуць надаць патрэбным зьяўленьнем на дзе



Паравы дарожны каток пабудаваны Калужскім заводам НКШЗ. Раней гэтыя каткі ўвозіліся з-за граніцы.

джаньні Цэнтральнага штабу пры ЦК КП(б)Б для дакладу аб ходзе Месячніка.

Цэнтральны штаб даў задавальную ацэнку гэтым абураючым выкананьнем і зрабіў адпаведныя вывады.

Гэта павінна зьявіцца вурокам для ўсіх тых раённых арганізацый і асобных работнікаў, якія сваёй апартуністычнай дзейнасьцю перашкаджаюць і зрываюць ажыцьцяўленьне важнейшай задачы—ліквідацыі адставаньня тэмпаў дарожнага будаўніцтва ад тэмпаў разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці.

Раённыя выканаўчыя камітэты, сельсаветы, райкалгасасаюзы і іншыя арганізацыі павінны зараз-жа разгарнуць шырокую масавую работу, мабілізаваўшы масы рабочых і калгасьнікаў на ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і мерапрыемстваў вызначаных Калгасцэнтрам на правядзеньні месячніка.

Райкомы КП(б)Б павінны забясьпечыць штодзённае партыйнае кіраўніцтва гэтай справай.

Ліквідаваць за час месячніка прарывы ў падрыхтоўцы да дарожна-будаўнічага сэзону—баявая задача ўсёй савецкай грамадзкасьці.

Цэнтральны штаб папярэджвае

У зьвязку з тым, што рад раённых штабаў не зьяўляюцца на паседжаньні Цэнтральнага штабу пры ЦК КП(б)Б для дакладу аб разгортваньні работ па месячніку, — Цэнтральны штаб на сваім паседжаньні 25-II пастанавіў:

«Лічыць зусім недапушчальным няўку старшынь райштабаў: Менскага, Бешанковіцкага, Полацкага, Лепельскага, Расонскага і Асіпавіцкага з дакладамі Цэнтральнаму штабу аб становішчы работ па ліквідацыі прарыву ў падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону.

Апошні раз папярэдзіць, што ў выпадку няўкі на наступныя паседжаньні Цэнтральнага Штабу, пытаньне адносна мер узьдзейнічаньня будзе перадана ЦКК КП(б)Б».

„Рэчыцкая Праўда" уключылася ў месячнік

Рэчыца. (Белта). Ня гледзячы на правядзеньне месячніку, справа забясьпячэньня выкананьня пляну дарожнага будаўніцтва ў Рэчыцкім раёне застаецца па-за ўвагай раённых партыйных, савецкіх, і прафсаюзных арганізацый.

Райвыканком абмежаваўся тым, што вызначыў для перавозкі матар'ялаў дарбуду некалькі сельсаветаў. Райпрафсавет яшчэ толькі... мяркуе заняцца пытаньнем дапамогі дарбуду. М'ж тым посьпех дарожна - будаўнічага сэзону ў асноўным залежыць ад якасьці праведзенай падрыхтоўчай работы, падвозкі матар'ялаў, каменьня, пяску і г. д. на месца пабудовы.

Дораддзел склаў штаб штурму, які вызначыў рад канкрэтных мерапрыемстваў для забясьпячэньня падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону 1932 г. Асаблівая ўвага накіравана на палепшаньне канкрэтнага кіраўніцтва і зьнішчэньня абязьлічкі ў рабоце.

Раённая газэта «Рэчыцкая праўда» уключылася ў месячнік штурму і, сумесна са шматтыражкай Дарбуду «Чырвоны шлях», памецілае рэйды ўдарнікаў друку на вучастках і Дняпроўскай дамбе, арганізуе кантрольныя рабкораўскія пасты.

„Вольніца" да здабычы не гатова

6 умоў тав. Сталіна ня спетлі яшчэ ў аснову работы Шклоўскага торфазаводу. Да сэзону 1932 году торфазавод не рыхтаваўся. Будаўніцтва стаіць лоўкі і барака, якое пачалося пры першым дырэктары, ня скончана і па сёньняшні дзень з-за недахопу будаўнічага матар'ялу і абсталяваньня.

Будматар'ял і інвантар, які меўся, разбазараны дырэктарам торфазаводу. 22 куба-мэтры пілавога матар'ялу, які павінен быў пайсьці для пабудовы бараку, адпраўлены торфазаводу ў Грабнёва, а некалькі скрынак цьвікоў разданы чыгунцы, папяровай фабрыцы і калгасам.

У будаўніцтве маецца затрымка і з боку Шклоўскага леспрамгасу. Леспрамгас не дадае торфазаводу 700 кубамэтраў лесаматар'ялу.

Будаўнічы матар'ял дырэктар торфа заводу вельмі часта скарыстоўвае ў якасьці апалу ў той час, калі ў лесе маецца 15 кубамэтраў нявывезеных дроў.

Рабочае забясьпечаньне ў загоне. Дырэкцыя ня ведае куды прыкладзены рабочыя для атрыманьня прадуктаў і прамтавараў. Адпушчаныя 50 пар ботаў для забясьпечаньня рабочых былі зьвернуты дырэктарам заводу райсаюзу.

Ударнікі не прэм'юцца.

У выніку такога забясьпечаньня, назіраецца пакіданьне заводу.

Зараз завод зусім спыніў усякую работу. Ніводзін рабочы не працуе, за тое «працуе» шматлікі апарат служачых у колькасьці 12 асоб. Штат атрымлівае 1.355 руб. зарплаты і нічога ня робіць. У выніку гэтага маецца вялікі перавыдатак сродкаў.

Торфазавод пераданы спажыўку на пяровай фабрыкі «Спартак». Дапамогі з боку «Спартака» няма, ня гледзячы на тое, што фабрыка ўрэшта забясьпечваецца апалам.

Разбазарэньнем матар'ялу, дырэктар торфа заводу вельмі часта скарыстоўвае ў якасьці апалу ў той час, калі ў лесе маецца 15 кубамэтраў нявывезеных дроў.

Разбазарэньнем матар'ялу, камэнданцкія пасты, падвозкі матар'ялу, каменьня, пяску і г. д. на месца пабудовы.

Дораддзел склаў штаб штурму, які вызначыў рад канкрэтных мерапрыемстваў для забясьпячэньня падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону 1932 г. Асаблівая ўвага накіравана на палепшаньне канкрэтнага кіраўніцтва і зьнішчэньня абязьлічкі ў рабоце.

Раённая газэта «Рэчыцкая праўда» уключылася ў месячнік штурму і, сумесна са шматтыражкай Дарбуду «Чырвоны шлях», памецілае рэйды ўдарнікаў друку на вучастках і Дняпроўскай дамбе, арганізуе кантрольныя рабкораўскія пасты.

Ф Вальфовіч

СТАНОВІШЧА КІТАЙСКАГА СЯЛЯНСТВА У ПРАВІНЦЫІ ШАНЬСІ

У кітайскім часопісу «Піплс Трыбюн» зьявіўся артыкул за подпісам студэнта аднаго з кітайскіх унівэрсытэтаў.

Некалькі старонак, прысьвечаных становішчу сялянства ў правінцыі Шаньсі напісаных рукой студэнта-гамінданаўца зраб'ўшага пералік фактаў без аналізу і вывадаў даюць дастатковае ўяўленьне аб становішчы кітайскага сялянства, прыдушанага галечай, непасільнымі падаткамі, моцна ссыпсутага лапай памешчыка, растаў шчыка, купца, вымяраючага ад голаду, неўраджаю, стыхійных няшчасьцяў, якое прадае сваіх жонак і дзяцей у няволю.

Было абсьледвана некалькі раёнаў «узорнай» правінцыі Шаньсі.

«Рэформы», піша студэнт, якія павінны былі «рэарганізаваць» сельскае кіраўніцтва, сапраўды праведзены. Але так званая «рэарганізацыя» сельскага кіраўніцтва азначала толькі пад васьніе падатковага абкладаньня сялянства.

«Рэформы» зводзіліся толькі да арганізацыі асобнай адміністрацыі ва ўсіх сёлах, ня лічачы самастойнага бюро, прызванага «кантраляваць» усе па сёлах.

У выніку лік так званых кіраўнікоў, стаячых на чале паселішчаў, значна ўзрос. А адсюль значна вырасьлі і дадатковыя падаткі.

Калі ўлічыць, што ў правінцыі існуе 621 «тэрыторыя», і калі ўлічыць, што штомесячны аклад кіраўніка «тэрыторыі» хістаецца ад 20 да 40 даляраў, дык малюнак стане яшчэ больш выразным.

«На працягу апошніх год, — піша студэнт, — стыхійныя няшчасьці, надыходзячыя адно за адным, яшчэ больш паглыбілі роспачлівае становішча сялянства». Больш 70, або прык ладна ¾ акругаў у той або іншы час падлягалі розным няшчасьцям. Значнае месца ў радзе гэтых няшчасьцяў адводзіцца вайне. Вайне, якая вядзецца генэраламі мілітарыстамі за перадзел правінцыі. Вайне, якая ўшчэнт разбурае кітайскае сялянства.

«Пачынаючы з 27 году ¾ усіх раёнаў пацярпелі ад вайны, засухі, паводак, а як вынік гэтага — голад. Голад, які ў адзін з пэрыядаў ахапіў больш 6.000.000 сялян гэтай правінцыі» (з агульнага ліку насельніцтва ў 11.800 тысяч чалавек, г. зн. больш паловы). У 1929 годзе толькі адна за суха зьнішчыла ўраджай бавоўны на 30.000.000 даляраў. 800.000 чалавек на мерла з голаду. «25 округ паўднёва-заходняй часткі правінцыі былі зусім спустошаны». Паўночна - заходняя частка правінцыі таксама пацярпела ад гэтых няшчасьцяў.

«Аднак ня гледзячы на нясупынныя няшчасьці, — піша студэнт, — цана на зямлю ня зьменшылася. Наадварот, яна нясупынна павялічвалася на працягу апошніх 10 год».

У правінцыі Гаундун 1916—26 год цана на зямлю павялічылася ад 60 да 300 проц., у Шаньсі (1919-29 г.) ад 150 да 500 проц.

Вораная зямля ў Шаньсі расцэньваецца па цане ад 200 да 300 даляраў, г. зн. 100—150 залатых рублёў за му (1/16 дзес.), фактычна 80 проц. усяго кошту земляробчай прадукцыі ідзе на ўплату арэнды за зямлю.

«Ня толькі людзкая праца тапная і амаль ня мае попыту. людзі самі як такавыя, сталі тапней чым збожжа або зямля».

Маладыя жанчыны і дзяўчаткі, галоўным чынам у округах пацярпеўшых ад няшчасьцяў, купляюцца з «мэтай нявольніцтва або прастытуцыі ад 2 да 25 даляраў за галаву»

І на працягу толькі аднэй зімы 1929-30 г. звыш 10.000 жанчын былі прададзены ў няволю.

Наступная табліца зьяўляецца тыповым прыкладам статыстыкі нявольніцкага гандлю ў гэтай правінцыі.

У раёне Лінсін прадана 1.000 чал.
» Ньньфынь » 1.230 »
» Ву-нен » 1.634 »
» Датун » 2.050 »
» Цечжэн » 2.651 »

«Калі разглядаць далей становішча селяніна, — піша студэнт — з пункту гледжаньня эканамічных праблем, дык трэба адзначыць, што фактычна ва ўсіх тэрыторыях гэтай «узорнай» правінцыі пануюць фэадальныя парадкі».

У якасьці прыкладу можна падаць вёску Цзіншы. Зямля тут расцэньваецца ад 100 да 150 даляраў за му (1/16 дзес.). З 95.500 му воранай зямлі гэтай вёскі толькі 2.000 му належыць сялянам. Астатняя належыць памешчыкам і здаецца ў арэнду. Памешчык звычайна плаціць штогадовы падатак дзяржаве ў разьмеры ½ даляра за му (з часьцей за ўсё і зусім яго ня плаціць) а штогадовая рэнта сялян складае суму ад 7 да 10 даляраў за му. У падатак да гэтага землеўласьнік мае ў якасьці ўласнасьці крамы і млыны. Сялянін, які пазычыў. у памешчыка прошы або насеньне, абавязаны ня толькі кожны месяц плаціць ад 2 да 5 проц. за ўзятую суму, але абавязан таксама купляць тавары ў краме памешчыка, прадаваць памешчыку свой ураджай, а таксама карыстацца млыном памешчыка.

«Большасьць сялян у гэтай «узорнай» вёсцы з году ў год ня толькі не пакрывае сваіх расходаў і ня мае ніякага прыбытку, але стаіць перад тварам поўнага разарэньня.

«Селянін лічыць сябе шчасьлівым, калі ён к канцу ўраджайнага сэзону мае ў сваім распараджэньні суму ў 22-27 даляраў, г. зн. 11—14 залатых рублёў, з якіх ён яшчэ павінен заплаціць рэнту памешчыку.

На поўначы і поўдні правінцыі Шаньсі сяляне маюць зямлі ў разьмеры ад 25 да 30 му, г. зн. 1½—2 дзесяціны (гэтае становішча ўжо лічыцца добрым, у параўнаньні з іншымі мясцовасьцямі, дзе сяляне маюць 5 му зямлі). Выбухнуўшы ў гэтай частцы правінцыі голад давёў да жабрацтва вялізарную колькасьць сялянскіх сем'яў. Улады прымушаны былі зьменшыць падатак, але як толькі востры пэрыяд прайшоў, падаткі былі зноў павялічаны. Мала таго, на працягу першых 10 месяцаў 1930 году быў сабраны падатак адразу за тры наступных гады 1930, 1931, 1932.

Карэспандэнт кітайскай газ. «Цзньцзін Да Гун бао», які вандраваў па правінцыі, адзначыў, што ў паўднёвых раёнах правінцыі Шаньсі зямель ны падатак у 10 разоў вышэйшы, чым у сяўтэнай частцы правінцыі Хо-бэй (Чжылі), дзе падатак таксама дасягае не малых разьмераў.

«Ніякае эканамічнае вывучэньне становішча сялян,—піша студэнт,—не зьявіцца поўным бяз вывучэньня пытаньня аб «незаконным» гандлі наркотыкамі, гандлі, які ўтвараецца па ўсёй правінцыі».

Сяляне ня толькі сыстэматычна атручваюцца рознымі наркотычнымі сродкамі, але і нясуць на сабе дадатковы цяжар усіх падаткаў на опіум, морфій і г. д.

«Паводле афіцыйных падлікаў, насельніцтва Шаньсі штогод плаціць 70.000.000 даляраў падатку за опіум і морфій. Гэтая сума амаль удвая больш шая гадавога прыбытку правінцыяльнага казначэйства».

Культывіраваньне опіуму зьяўляецца даходным артыкулам для памешчыка, купца, растаўшчыка.

«Гавораць, што толькі са сталіцы правінцыі, яго менш, чым на 120.000 да ляраў, распаўсюджваецца штодня морфія (у пілюлях і парашках) у розных акругах правінцыі».

«У аднэй з вёсак, дзе я быў,—піша студэнт, — з 660 чалавек — 163 чалавекі вядомы, як спажыўцы наркатычных сродкаў».

Агульная затрата на опіум і морфій у гэтай вёсцы амаль раўнялася ўсяму прыбытку з 3.700 му апрацоўваемай

Дыспэтчары кіруюць рухам цягнікоў

Але ня ўсю ы для іх работы створаны ўмовы. Ня ўсе дыспэтчары сталі сапраўднымі арганізатарамі руху. Змагацца за добрага дыспэтчара, за стварэньне ўсіх умоў для дыспэтчарскай работы

За чоткае кіраваньне

Рух цягнікоў, своячасовае сьледваньне іх па раскладзе—значна залежаць ад таго, як будуць працаваць на вузлах дыспэтчарскія групы, як яны будуць кіраваць готым рухам. Работа дыспэтчарскіх груп патрабуе пільнай увагі да яе і канкрэтнай дапамогі. Гэты вучастак работы—рашаючы вучастак.

Аднак, факты, якія прыводзяцца ніжэй (асабліва са Жлобінскага рабу) сьведчаць аб тым, што ня ўсюды забясьпечана нават мінімальная колькасьць умоў для дыспэтчарскай работы. Нават дзьверы, скрыні якіх перашкаджае напружанай рабоце, не адрамантаваны, да работы не прыстасаваны. Ёсьць шэраг іншых дробных перашкод, якіх ні ў якім разе нельга цярпець і якія можна тлумачыць выключнай непаваротлівасьцю, бюрак ратызмам і коснасьцю работнікаў з адміністрацыі.

Пераход на алзіную зьмену з лінія-мі—на гэты верны шлях чоткага руху цягнікоў—у раёнах, як сьлед не прапрацаваны, не зразумета сутнасьць гэтага мерапрыемства і таму яно, напрыклад, у Жлобінскім раёне проста байкатуецца.

Дыспэтчарскія групы з цягам часу павінны папаўнацца новымі, добраваліфікаванымі работнікамі. Для дыспэтчарскіх груп патрэбны падзейныя кадры. Арганізацыі, на якія ўскладзена адказнасьць за іх падрыхтоўку, нічога яшчэ не зрабілі.

— Няма кадраў!—гавораць яны.

А там, дзе няма кадраў, дзе кадраў не хапае, іх трэба па-бальшавіцку рыхтаваць Ва ўсіх раёнах, асабліва ў Жлобінскім, трэба неадкладна разгарнуць дыспэтчарскую вучобу, падрыхтоўку новых дыспэтчароў. Вучобу арганізаваць без адрыву ад вытворчасьці, прыцягнуць да яе кадравых дыспэтчароў і іх вопыт шырока распаўсюдзіць і рэалізаваць. Камсамольскія ячэйкі павінны ўключыць у дыспэтчарскую вучобу лепшых сваіх камсамольцаў, якія ў далейшым змогуць стаць сапраўднымі камандзірамі руху.

Ставіць пытаньне аб падрыхтоўцы кадраў! Усю ўвагу—на стварэньне ўмоў для дыспэтчараў.

Апэратары, якія не авалодалі тэхнікай сваёй работы і гэтым перашкаджаюць кіраваньню рухам цягнікоў, павінны рэзка пераключыцца на новыя рэйкі.

Ва ўсёй рабоце замацоўваць гасяг нутыя посьпехі. Поўнае сьледваньне па раскладзе ўсіх цягнікоў па пятым эксплёатацыйным раёне, якое было да сягнута ў апошніх мічбах студзеня, трэба замацоўваць, зрабіць яго штодзённым.

КАМАНДЗІР РУХУ

павінен атрымаць належныя ўмовы работы

(АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Дыспэтчару дадзена ганаровае імя камандзіра руху. У гэта імя закладзены глыбокі, зьместоўны сэнс. У руках дыспэтчара сыходзяцца ўсе ніці кіраваньня рухам цягнікоў на вучастку, з дыспэтчарскай — як са штабу— ідуць загады па кіраваньні.

«Але ў Жлобінскім чыгуначным раёне ня ўсё забясьпечана для правільнага кіраваньня рухам цягнікоў. Уявеце малюнак. Дыспэтчар, схіліўшыся над графікам, шукае вернага ходу, які з'эканоміў-бы хвіліны, адхіліў-бы бескарысны прастой, забясьпечыў-бы своячасовы рух цягніка, выкананьне графіку. І... раптам гасьне сьвятло. Дыспэтчар у цемры, у поцемках пны парыць па кладоўках, шукае газавай лямпы, пасылае, нарэшце, да аглядчыкаў за сьвечкамі. У выніку гэтага рух цягнікоў пераблытаны.

У Жлобіне гэта стала звычайнасьцю і ніколькі ня турбуе адміністрацыю.

Дыспэтчарскі габінэт — гэта штаб кіраваньня. У Жлобінскіх «штабах» рыпяць дзьверы, перабіваюць размовы па сэлектары. Калі ў адным габінэце ідзе перадача загадаў, дык суседні дыспэтчар лаецца і чакае іх сканчэньня, бо ўсё чуваць праз сьцены. Лямпы вельмі шчыра асьвятляюць стол, але толькі ня стол дыспэтчара. Габінэт дыспэтчара менскага кірунку прахадны, праз яго нясупынна ходзяць, разьбіваючы ўвагу, бянтаючы думкі.

Дыспэтчар у Жлобіне ня мае дыспэтчарскай лінейкі, ня мае табліцы пазьменнага ходу цягніка па перагонах у залежнасьці ад яго ваг, няма актаў з паказаньнем станцый, на якіх дазволены прыём цягнікоў па ня правільным шляху. Хутка будуць уведзены новыя правілы тэхнічнай эксплёатацыі. Выгукне сэлектар: «Дыспэтчар скажы як быць у такім выпадку». І нічога ня зможа сказаць дыспэтчар, бо ён ня мае новых правілаў, ня мае ўклеек да іх.

У Жлобіне зусім мала зроблена для таго, каб забясьпечыць належныя ўмовы для сапраўднага, чоткага абдумванага кіраваньня рухам. Добрае ведзеньне цягнікоў ператорвана тут у нікчэмнае саматужніцтва. У гэтым галкам вінавата адміністрацыя аддзелу руху.

Стварыць плян руху, намеціць канкрэтныя меры дзеяньняў дыспэтчар зможа толькі тады, калі ў яго дыспэтчыплінаваныя работнікі, калі яны чотка выконваюць заданьні, дакладваюць аб сваёй рабоце. Але што можа спланаваць дыспэтчар, калі эсіпаніцы, касінкавіцкі і магілёўскі апэратары не даюць дакладных вестак аб падыходах, калі жлобінская зьмена Глазаў кага «крадзе» рэшткі вагонаў, а потым яны раптам выяўляюцца і вісяць грузам на вымернікі, на намечаныя ўжо цягнікі.

Як можна кваліфікаваць такую «апэрацыйнасьць», калі жлобінскі апэратар Сяргей паведамляе пра адпраўленьне цягніка, дыспэтчар рыхтуе для яго скрыжаваньне на бліжэйшай станцыі, а праз некаторы час Сяргей спакойна заяўляе: «Дыспэтчар! Ведаеш, 632 яшчэ не пайшоў». Як працаваць з Сяргеем, калі ён ня выконвае загадаў, калі ён адказвае дыспэтчару ня чоткім выкананьнем, а лаянкай.

А ў той-жа час ёсьць апэратары, як Шульгоў, як сапраўды апэрацыйна і дзелавіта працуюць.

Разам з дзяжурным па дэпо дыспэтчар клапоціцца аб своячасовым адпраўленьні цягніка, разам з ім дыспэтчар апэруе паравозамі. Тут дамоўленасьць ёсьць поўная. Ёсьць кантакт. Але яго няма яшчэ па сваім аддзеле — са станцыямі. На станцыях дыспэтчар часта сустракае бяздушных фармалістаў, нядбайнікаў.

Стройна пабудаваны графік часта парушае адчэпка па гарэньні букс, за трымка з наборам вады, нагон пары ў дарозе. Тут цягавік бывае прычынай, якая вырывае з рук кіраўніцтва. З гэтым вядзецца барацьба. Але нічога ня зроблена для адхіленьня іншых тормазаў, што эрабіць ня так цяжка.

У Магілеве не хапае паравозных брыгад. Цягнікі часта водзяць жлобінскія паравозы. Парушаецца зварот, нельга іншы раз разьлічваць на гатоўнасьць паравоза пад цягнік. Часта незнаёмы з профілем вучастку машыніст спазьняецца, выводзіць састаў па частках. А ёсьць паравозы (1569, 1685, 2415), брыгады якіх добра езьдзяць па Магілеўскім вучастку, ведаюць яго. Чаму-ж не замацаваць іх для паездак пакуль урэгулюецца пытаньне з магілеўскімі брыгадамі? Кантакту з начальнікам дэпо няма, дамоўленасьць адсутнічае, а графік фіксуе гэты недахоп, няроўнай рысай спазьненьняў, зрываў раскладу.

Камэрцыйная хуткасьць цягніка ня можа быць вымяральнікам якасьці работы дыспэтчара. Гэта — формула, ад якой не адступіць дыспэтчар. Ён назаве вам рад іншых акалічнасьцяй, прычын, выпадкаў. Іх трэба аналізаваць, вывучыць, каб назаўсёды адхіліць. У Жлобіне гэтага ня робяць, тут няма аналітычнай групы. Няма і аб'яднаючых дыспэтчароў, якія кантактавалі-б работу дыспэтчароў асобных кірункаў.

— Няма кадраў! — заўжды адказвае адміністрацыя. А ці рыхтавала яна іх? На гэта адказу не пачуеце.

Нядаўна жлобінскія дыспэтчары аб газарылі прапаноўку дэбальцаўскіх дыспэтчароў аб адзінай зьмене з лініяй і нарашылі перайсьці на яе. Але і тут няма поўнай яскравасьці: на Менскім вучастку графікі станцый не супадаюць з графікамі дыспэтчароў. І адміністрацыю гэта ня вельмі турбуе. Адзіная зьмена верны шлях да зжыцьця спазьненьняў, да выкананьня загаду наркому аб павялічэньні карыснай работы паравоза і вагона, да зжыцьця шкодных абязьлічкі ў эксплёатацыі, да наладжваньня руху — у Жлобіне відавочна недзацэньваецца.

Патрэбна стварыць для дыспэтчароў усе ўмовы для чоткай работы, патрэбна хутчэй аформіць пераход на сапраўдную адзіную зьмену а лінейнымі станцыямі. Камандзіру руху трэба даць работнікаў, якія ведалі-б справу і маглі-б па-бальшавіцку працаваць.

Ц. Кашын.

Мае „найдзічы" і перамогі

Вынаходца М. В. Шаблоўскі

Паходзячы з сям'і чорнарабочага, некалькі год працую на чыгунцы. Уважліва і па-пралетарску адносячыся да сваёй работы, у мяне пачалі нараджацца думкі аб рэканструкцыі тых варштатаў, на якіх працаваў, аб удасканальваньні тых прылад, якімі карыстаюся, па заводзе «Полымя рэвалюцыі».

Але калі я ўпяршыню прапанаваў

Дыспэтчар па сьнегабарацьбе пры 11 дыстанцыі т. Навумавец.

прырабіць фрэзерную галоўку да токарнага варштату, з мяне сьмяяліся. А былы начальнік цэху Шчацінкоў заявіў:

— Запішэце, што з гэтай думкі нічога ня выйдзе.

Але я пачаў дзейнічаць. Дамовіўся з былым майстрам кавальнага цэху аб тым, што я зажаку вырабіць зусім другі прэс, але меў на ўвазе сваю ранейшую прапанову. Ён згадзіўся і я сакрэтна пачаў ажыцьцяўляць свае мерапрыемствы. Пасьля вырабу варштату ў часе яго выпрабаваньня аказалася, што патрэбна было пад'ёмных кулакоў, варштат пачаў бліскуча працаваць. З таго часу варштат заслужыў на заводзе ўсіх апраўданую павагу.

Пазьней варштат удасканальваўся сьлёсарам Сьцепанюком і даў для заводу вялізную эканомію (каля 10.000 руб.).

Пазьней я прапанаваў ручны прэс для дробнай штамповкі, нарэзкі і пад рэзкі піл. Вынайшаў станок для нарэзкі палоцен, які дасьць магчымасьць у сябе на заводзе вырабляць іх і забясьпечваць абменныя пункты. Быў прапанаваны падагравацель вады для забясьпечаньня паравых катлоў гарачай вадой. Тут я меў на ўвазе тую акалічнасьць, што нафтавыя печы ў часе награваньня пакоўкі шмат цяплыні ад даюць у паветра, праціцца шмат апалавых сродкаў. Я прапанаваў ставіць кацёл над выхадам гэтых гарачых газаў з пяцьцю абаротамі для большай паверхні нагрэву. Я ведаю, што яшчэ на многіх транспартных заводах у паветра ідзе шмат патрэбнай цяплыні, дзясяткі і сотні тон патрэбнага апалу скарыстоўваюцца бяз вынікаў. Мая прапанова патрабуе яшчэ большага удасканальваньня, над ёй павінны папрацаваць ня толькі адзін я, а інжынэрна-тэхнічны пэрсанал, які дапаможа мне выправіць магчымыя памылкі.

Для эканоміі напільнікаў, для адточваньня істужкавых піл, на што раней выдаткоўвалася шмат лішняга часу, ды была дрэнная якасьць, я прапанаваў варштат, які адхіляе ўсе гэтыя дэфэкты і дае шмат эканоміі. Было зроблена шмат дробных вынаходак: нарэзка гаек на балтарэзным варштаце, што зьнізіла сабекошт кожнай на 12 кап., а ў год тысяч на пяць.

Зараз удваёх са сьлёсарам напала заводу тав. Сьцепанюком выраблям штамп для гаек з дзюркамі. Штамп павінен вызваліць тры зьмены сьвідравальнікаў, якія тады ня будуць патрэбны; павінен ліквідаваць бяжжаласнае псаваньне і ломку соцень сьвёрлаў і на шмат падвысіць якасьць прадукцыі. Усё гэта адаб'ецца ў тысячах рублёў эканоміі.

Разгортваючы і надалей вынаходніцкую работу, я буду патрабаваць ад усіх заводзкіх арганізацый пільных і ўважлівых адносін да ўсіх вынаходцаў. Усіх іх (вынаходцаў) выклікаю абмяняцца вопытам работы праз газэту «Савецкая Беларусь».

Вывезьці грузы з мясц, якім пагражае паводка

(Пастанова прэзыдыюму Камітэту па перавозках пры Дзяржпляне БССР)

У выкананьне пастановы Камітэту па перавозках пры СПА ад 17 студзеня 1932 г. прапануецца:

1. Абавязаць гаспадарчыя арганізацыі, якія маюць грузы для перавозак па чыгунках, але знаходзяцца ў мясцох, якім пагражае паводка, на працягу лютага і сакавіка адгрузіць і арганізаваць адпраўку строга па пляне маршрутнымі цягнікамі. Разьлічыць плян так, каб поўнасьцю адгрузіць да пачатку паводкі.

2. Абавязаць гаспадарчыя арганізацыі своячасова вывезьці аўта-гужавым транспартам з патапляемых месц грузы мясцовага значэньня.

3. Абавязаць гаспадарчыя арганізацыі ў тых плянавых заяўках, якія даюцца Камітэту па перавозках, вызначыць грузы, падлягаючыя вывазу з затапляемых месц, а заходні РУПР прасіць прыняць захады да поўнага і своячасовага забясьпечаньня падачы рухомага складу, згодна норм, зацьверджаных плянамі на люты і сакавік.

4. Забараніць гаспадарчым арганізацыям у далейшым падвозіць і складаць грузы ў мясцох, якім пагражае паводка.

5. Прапанаваць Гомельскаму гарсавету і адпаведным РВК арганізаваць спэцыяльныя камісіі, якім даручыць:

а) Высьвятліць, разам з прадстаўнікамі эксплёатацыйных раёнаў (Гомельскага, Жлобінскага, Аршанскага і Віцебскага), колькасьць і род грузаў, падлягаючых вывазу з затапляемых месц у паасобку як па чыгунцы, так і аўтагужавым транспартам.

б) У пяцідзённы тэрмін устанавіць каля рэчак абаронныя зоны для складаньня грузаў, падлягаючых для перавозкі і хаваньня, за выключэньнем грузаў, прызначаных для сплаву.

в) Распрацаваць каляндарны плян вывазкі грузаў, якія знаходзяцца ў мясцох, неабароненых ад паводкі і на ладзіць пяцідзённы ўлік вывазу і ўборкі іх.

г) Адказнасьць за своячасовую вывазку грузаў з затапляемых месц ускласьці на гаспадарчыя арганізацыі і вызначаныя камісіі.

д) Адбіткі пратаколаў аб вылучэньні камісій, установленых месц і выяўленьні колькасьці грузаў, а таксама і аб намячаемых мерапрыемствах па вывазцы іх — прадстаўляць у Дзяржплян, Камітэту па перавозках.

Пастанову надрукаваць у газэце «Савецкая Беларусь».

Старшыня Камітэту па перавозках пры Дзяржпляне БССР Пятрыкевіч.

Адк. Сакратар Хацкевіч.

Падрыхтоўка да сяўбы

Насеньне--сыравіна бальшавіцкага ўраджаю--

павінна быць у поўнай гатоўнасьці да веснавой сяўбы

28 лютага

Цэнтральнай задачай работы па падрыхтоўцы да сяўбы ў бліжэйшыя тыдні—зьяўляецца стварэньне насенных фондаў. Між тым, гэты адказнейшы вучастак работы ў нас, у БССР зьяўляецца самым адсталым. У сярэднім па рэспубліцы мы ня маем нават паловы выкананьня пляну засыпкі насенных фондаў. Такое стаўленьне з работай па стварэньні насенфондаў зьяўляецца вынікам апартуністычнай стаўкі на самацёк цэлага раду шэфскіх партыйных, савецкіх і зямельна-калгасных арганізацый, якія не зразумелі вялікай важнасьці выкананьня гэтай першай рашаючай ўмовы падрыхтоўкі сяўбы.

Асабліва дрэннае становішча мы маем на вучастку цэнтралізаваных загатовак насеньня траў і гародных культур. Так, плян загатовак насеньня траў выкананы на 15,7 проц., а па гародных культурах толькі на 14,7 проц.

Кулак і яго агентура імкнуцца сарваць усякага роду загатоўкі ў тым ліку і загатоўкі насеньня. Гэта і зусім зразумела, бо наш клясавы вораг добра разумее, што насеньне—гэта асноўная сыравіна бальшавіцкага ўраджаю.

У радзе месц кулак распальваючы спажывецкія, дробна-ўласьніцкія настроі сярод адсталых груп калгасьнікаў імкнецца сарваць загатоўкі насеньня. Кулак агітуе каб ліпкі, якія застануцца ад засыпкі насенфондаў, падзя ліць паміж калгасьнікамі. Гэтым кулацкім тэндэнцыям трэба даць самы рашучы адпор.

Змагаючыся з кулацкімі спробамі сарваць загатоўкі адпачасова трэба змагацца з упрыманьскімі настроямі сярод калгасьнікаў, што «дзяржава без насеньня нас не пакіне». Характарна адзначыць, што гэтыя разважаньні прыходзяцца чуць у той час, калі калгас нічога не зрабіў каб мабілізаваць свае ўнутраныя насенныя рэсурсы,—калі мышы зьнішчаюць немалочанае насеньне (Жлобінскі раён).

У сувязі з маючымися фактамі ўпрыманскіх настрояў сярод калгасьнікаў патрэбна шырокая масавая праверка наяўнасьці насеньня ў калгасах, патраб на сапраўды масавы кантроль над тым, каб выкарыстаць усе рэсурсы калгасу для стварэньня насенфонда. Трэба на справе рэалізаваць пастановы аб унутрыкалгаснай пазыцы насеньня ў калгасьнікаў і аб міжкалгасных пазыках тым калгасам, каторыя сапраўды пацярпелі ад неўраджаю і ня маюць насеньня. Дапамогу ў стварэньні насенфонду атрымаюць толькі тыя калгасы, якія поўнасьцю мабілізуюць унутраныя насенныя рэсурсы.

Посьпехі выкананьня першачарговай рашаючай работы па падрыхтоўцы да сяўбы, работы па стварэньні насенфондаў будуць цалкам залежыць ад таго, наколькі партыйныя, савецкія і зямельна-калгасныя арганізацыі своячасова і добра ўсьвядомяць, што «цэнтральнай задачай іх работы на вёсцы ў бліжэйшыя тыдні зьяўляецца стварэньне насенных калгасных фондаў у разьмерах, неабходных для поўнага выкананьня пасеўнага пляну». (З пастановы СНК і ЦК УсеКП(б).

Насеньне ёсьць, але яго трэба сабраць

ЖЛОБІН. (Наш кор.). Дыяктыва партыі і ўраду аб засыпцы насенных і страхавых фондаў у раёне зрываецца. На 20 лютага, плян засыпкі насеньня зерневых культур па Жлобінскім раёне выкананы на 39 проц., тэхнічных—25 проц.

Рад калгасаў не забясьпечаны насеньнем, між тым яны нічога ня робяць каб мабілізаваць унутраныя рэсурсы.

«Дзяржава дасьць насеньне, дык будзем сеяць»—заяўляюць кіраўнікі калгасу «Чырвонае Шчытнае», Скепнянскага сельсавету, «Эрштэ Май», «Ударнік», «Перамога» Папараўнянскага сельсавету. У калгасе «Чырвоны Кастрычнік», Мармальскага сельсавету яшчэ ня створаны насенны фонд зярнёвых культур з тае прычыны, што ня скончана малацьба, якая «пры добрых умовах», як заяўляе старшыня калгасу, будзе закончана праз тыдні два. Малацьба таксама ня скончана яшчэ і ў радзе іншых калгасаў (Днепроўскі, імя 12 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, «Серп і Молат» і інш.).

РВК, райза і райкалгасаюз не арганізавалі апэрацыйнае кіраўніцтва справай стварэньня насенных фондаў. Толькі 22 лютага ў сельсаветы былі накіраваны ўпаўнаважаныя РВК для фарсаваньня засыпкі насенных фондаў і арганізацыі ўнутрыкалгаснай і міжкалгаснай узаемадапамогі. Да гэтага-ж часу гэта важнейшая кампанія праводзілася самацёкам.

Стварэньне страхавых фондаў таксама зрываецца. На 20 лютага замест патрэбных 4.751 цэнт. не сабрана ніводнага цэнтнэра насеньня. Калгас «Перамога» Папараўнянскага сельсавету ў праўленьні якога знаходзіцца 75 проц. цьвёрдазаданьнікаў у тым ліку і сам старшыня калгасу Шэйчук, разьмеркавалі страхфонд па... працадзнёх, але да апошняга часу, ні сельсавет, ні партячэйка не далі рашучага адпору гэтай кулацкай практыцы.

Яшчэ горш абстаіць справа з загатоўкамі насеньня траў, кораннеплодаў і гародных культур. Райкалгасаюз у гэтым правяў апартуністычную бязьдзейнасьць. Так, на 20 лютага замест 784 цэнтнэраў лубіну загатоўлена толькі 2,11 цэнтн., вікі трэба 750 цэнтн., загатоўлена 17, канюшыны—плян 144 цэнтнэра, а ёсьць 0,21 цэнтн., сэрадэлы трэба загатовіць 72 цэнтн., але ніводнага кілё яшчэ не загатоўлена. Ніякіх мер для ажыўленьні гэтага прарыву ня прымаецца.

Такая недапушчальная маруднасьць у справе засыпкі і загатоўкі насеньня ставіць пад пагрозу зрыву выкананьне пляну сяўбы. Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны безадкладна пераключыцца на ўдарныя тэмпы справу стварэньня і загатоўкі насеньня.

Закраўсні.

Мабілізаваць унутраныя рэсурсы—своячасова закончыць засыпку насенфондаў

Слупак. Засыпка насенных фондаў па калгасах Случчыны праходзіць над звычай марудным тэмпамі. На 20 лютага плян стварэньня насенфонда зярнёвых культур выкананы на 61 проц., бульбы — на 51,5 проц., вікі і канюшыны — 36 проц., тэхкультур—на 34 проц.

Не па ўсіх калгасах выяўлены недахопы насеньня. З 175 калгасаў раёну далі зьвесткі толькі 110. Па гэтых 110 калгасах не хапае 494 цэнтнера збожжавых культур, 94 цэнтнера тэхнічных культур і 9.082 цэнтнеры бульбы.

Недахват насеньня ў калгасах як правіла ёсьць вынік адсутнасьці ўсякай работы па правядзеньні абмену насеньня паміж калгасамі. Райкалгасаюз не арганізаваў пераўкіді лішкаў насеньня з аднаго калгасу ў другі ў парадку абмену.

У часе разьмеркаваньня прыбыткаў і ўраджаю некаторыя калгасы («Чырвоны Кастрычнік») разьмеркавалі сярод калгасьнікаў і частку насеннага фонду. Некаторыя калгасы (імя Леніна і «Рэвалюцыя») не абагулілі насеньня бульбы.

(Белта).

Узор плянавай падрыхтоўкі да сяўбы

РАГАЧЭЎ. Калгас імя СЬВЯРДЛОВА ўдарна рыхтуецца да веснавой сяўбы. Стварэньне насенных і страхавых фондаў закончана. Ачыстка насеньня праведзена на 45 проц.

Калгас забараніраваў кармовы фонд для рабочых коняй на час веснавой сяўбы. Прыступлена да перавозкі мінэральнага ўгнаеньня. Праўленьне калгасу вылучыла калгаснікаў адказных за кожную галіну работы, якія сочаць за ходам падрыхтоўчай работы.

Брыгада рэйду: Я. САВІЦКІ, Х. КАДАКОЎ, Х. САВІЦКАЯ.

«ДАДУЦЬ НАСЕНЬНЕ— БУДЗЕМ СЕЯЦЬ...»

Засыпка насенфондаў—самы адсталы вучастак работы

ВУШАЧЫ. Засыпка насенных і страхавых фондаў—самы адсталы вучастак работы па Вушаччыне. На 20-га лютага плян засыпкі насенных фондаў па тэхнічных культурах выкананы толькі на 20 проц., па зярнёвых культурах—50 проц., кораннеплодах—10 проц.

Стварэньне насенных фондаў праходзіць самацёкам. Ні райза, ні райкалгасаюз ня маюць поўных вестак аб ходзе гэтай кампаніі. Зусім зрываецца абмен насеньня. Рад калгасаў да апошняга часу ня прыступілі да абмену звычайнага насеньня на сартовае.

Таксама марудна праходзіць ачыстка насенных фондаў. Зерноачышчальныя машыны поўнасьцю не ўкружаны.

Такія павольныя тэмпы работы ставяць пад пагрозу стварэньне насенных фондаў. Райком КП(б)Б павінен тэрмінова заняцца гэтай справай, забясьпечыўшы поўнае выкананьне і перавыкананьне пляну засыпкі насенных фондаў. (Белта).

Узор сапраўднай барацьбы за насенфонды

ДРЫСА. Калгас «Новы Шлях»—адзін з першых у раёне ўключыўся ў конкурс абвешчаны ЦО «Правдой» на лепшую працу низавога друку ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Калгас пераключыўся на ўдарныя тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы. Насенны фонд поўнасьцю засыпаны. Зараз праводзіцца ачыстка насеньня.

Калгас «Новы Шлях» уступіў у сацыпаборніцтва з калгасам імя Будзёнага на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы. 15 сакавіка вызначаны днём арганізацыі пробнага выезду ў поле. (Белта).

Раўняцца па перадавых

Віцебск. (Наш кар.) У радзе сельсаветаў раёну стварэньне насенных фондаў праходзіць пасьпяхова.

Па ўсіх калгасах Бараўлянскага сельсавету ссыпаны насенныя фонды. Некаторымі калгасамі па такіх культурах як вікі, бульба і гародніна пляны перавыкананы. У кожным калгасе працуе зерноачышчальны абоз.

У калгасе «Іскра» Віцебскага сельсавету таксама створаны ўжо насенны фонд. Насеньне захоўваецца добра, праводзіцца ачыстка яго.

Горш абстаіць справа з засыпкай насенных фондаў па калгасах Замастоцкага сельсавету. У чатырох калгасах сельсавету да гэтага часу ня вылучаны адказныя асобы за ссыпку і захаваньне насеньня. Ачыстка насеньня пачата, але яна праходзіць вельмі марудна. Тэмпы работы не гарантуюць, што ачыстка будзе скончана своячасова. У сельсавеце ёсьць усяго 3 зерноачышчальныя машыны, што зьяўляецца недастатковым.

Калгасы Замастоцкага сельсавету павінны раўняцца па калгасах Бараўлянскага і Віцебскага сельсаветаў у справе стварэньня насенных фондаў.

Шубін.

Узор сапраўднай барацьбы за насенфонды

ДРЫСА. Калгас «Новы Шлях»—адзін з першых у раёне ўключыўся ў конкурс абвешчаны ЦО «Правдой» на лепшую працу низавога друку ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Калгас пераключыўся на ўдарныя тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы. Насенны фонд поўнасьцю засыпаны. Зараз праводзіцца ачыстка насеньня.

Калгас «Новы Шлях» уступіў у сацыпаборніцтва з калгасам імя Будзёнага на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы. 15 сакавіка вызначаны днём арганізацыі пробнага выезду ў поле. (Белта).

Канакоцін, Фалько, Кап-кі

Няма бальшавіцкай настойлівасьці у разгортваньні лёназагатовак

Горкі—адзін з рашаючых лёнаводных раёнаў у Беларусі. 1.500 тын лёнавалакна — базвая праграма лёназагатоўчай кампаніі гэтага году. Раённае партыйнае кіраўніцтва, улічваючы, што даны Наркамснабам плян мінімальны, зусім правільна зрабіла высунуўшы сустручны, павялічыўшы плян з 1.150 да 1.500 тон.

Рэальнасьць пляну яшчэ раз сьвяджаецца тым, што Наркамснаб БССР свой плян вызначыў у 1,4 цэнтнера лёна-валакна з гектара. На сустрэчным пляне раённай арганізацыяй прадугледжана 1,8 цнт. з га, у той час, калі ўтвораная сіламі самога раёну ўкспэртыза ўсталявіла сярэдні валавы збор з гектара ў 2,27 цнт.

Гэта абвязвала раённыя арганізацыі разгарнуць шырокую масавую работу, забясьпечыўшы поўнае выкананьне ўзятых на сябе абавязацельстваў. Аднак, усе тэрміны, вызначаныя рэспубліканскімі і раённымі арганізацыямі для завяршэньня лёназагатовак, сарваны. На 20 лютага замест 100 проц. пляну загатовак выкананы толькі на 41,5 проц. (пляну Наркамснаба) і 32 проц. сустрэчнага пляну.

Адсутнасьць апэрацыйна - масавай работы, разважаньні і дэклярацыі замест канкрэтнай работы, распальваньне кулацка-спажывецкіх тэндэнцый у калгасах—вось тыя асноўныя прычыны, якія прывялі раён да такіх ганебных вынікаў.

Калгасны сэктар павінен здаць больш 70 проц. пляну. Рад перадавых калгасаў—«Завет Ільіча», імя Варашылава і інш.—на аснове зьдзелнічыны і правільнай арганізацыі працы датэрмінова выканалі плян здачы прадукцыі. Аднак, калгасны сэктар у цэлым на 20 лютага здаў толькі 51 проц. пляну.

Першапачатковую апрацоўку лёну калгасы сустрэлі непадрыхтаванымі. У большасьці калгасаў нават зараз няма плянаў пераапрацоўкі лёну, ня кажучы ўжо аб кантрольных і каляндарных тэрмінах.

Адставаньне калгаснага сэктару тлумачыцца, галоўным чынам тым, што гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў ня стала цэнтральнай задачай раённай арганізацыі. Фармальна, паводле даных раённых арганізацый, усе калгасы пераведзены на зьдзельнічыну а на справе ў радзе калгасаў існуе падзённічына. Вымернікам зьяўляецца палачка (працадзень), незалежна ад выконваемай калгаснікам работы. Ураўнілаўка, абязьлічка — вось што характарна для значнай часткі калгасаў раёну.

Сталыя брыгады па пераапрацоўцы лёну не арганізаваны. Прыкладныя нормы Калгасцэнтру БССР па апрацоўцы лёну ў значнай частцы калгасаў скрыўлены. У калгасах Паршынскага сельсавету нормы зьніжаны ў сярэднім на 40-50 проц. Наколькі ніз кія вызначаныя нормы, сьведчаць факты, што ў радзе калгасаў—«Адказ інтэрвэнтам», «Завет Ільіча», імя Варашылава і інш. ударнікі-калгаснікі ў сярэднім у паўтара-два разы перавыконваюць іх.

Наяўнасьць кулацка-спажывецкіх тэндэнцый, у апошні час набыўшых масавы характар, зьяўляюцца аднэй з прычын адставаньня калгаснага сэктару. У той час, калі большасьць калгасаў і калгасны сэктар у цэлым далёка ня выканалі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай, маюць месца масавыя факты разбазарваньня, разьмеркаваньня лёну па ўсякім зручным выпадку (на ніткі, на мяшкі і г. д.). Прычым амаль у кожным калгасе лён разьмяркоўваецца па-рознаму: на працадзень, на двор, на гектар і інш. У калгасах «Адказ інтэрвэнтам», «Новы сьвет» і інш. лён быў разьмеркаваны яшчэ ў часе ўборкі, прычым разлалі па 5 снопоў на адну калгасніцу з гектару. Разбазарваньне лёну часта адбывалася пад кіраўніцтвам асобных раённых работнікаў. У калгасе «Вясёлае жыцьцё» амаль поўнасьцю падзелены ўраджай лёну, прытым з угодзям і пад кіраўніцтвам інструктара райкалгасаюзу Цыркунова. Па ініцыятыве гэтага-ж «інструктара» у калгасе «Сацыялізм» скарыстана на подсьціл вялікая колькасьць лёну з прычыны таго, што Цыркуноў заявіў, што гэты лён быццам нявыгодна апрацоўваць, а эканомней скарыстаць яго на подсьціл. Раённае кіраўніцтва не мае ня ведаць аб наяўнасьці фактаў разбазарваньня лёну, што мела месца яшчэ ўвосень. Адсутнасьць барацьбы з такімі зьявішчамі прывяло да таго, што разбазарваньне лёну набыло масавы характар. У радзе калгасаў («Адказ інтэрвэнтам», «Чырвоны Кастрычнік» і інш.) значная колькасьць лёну знаходзіцца пад сьнегам, і ніхто на гэта не рэагуе.

Значная частка сельсаветаў і партыйных ячэек зусім ня кіруюць загатоўкамі. У Паршынскім, Кацялёўскім сельсаветах на працягу некалькіх гадзін нельга было нават знайсьці пляну лёназагатовак. Зьвестак аб ходзе выкананьня пляну па калгасах і па аднаасобным сэктары ў сельсавеце не аказалася. «Нам з раёну ня прыслалі зводкі»—зьдзіўлена адказалі сельсаветчыкі.

Камэнтарыі непатрэбны. Кіраўніцтва зямельна-калгасных раённых арганізацый (у прыватнасьці загатоўчых) пераапрацоўкай і загатоўкай лёну ў большасьці зводзіцца да гастралёрства і зьбіраньня зводак. Райкалгасаюз і МТС ня ведаюць сапраўдных прычын адставаньня калгасаў. Досыць адзначыць, што ўпаўнаважаны райкалгасаюзу Тарасенка, пабываўшы за некалькі дзён у Чарняўскім і Ждановіцкім сельсаветах і пасьпеўшы пераехаць у Паршынскі, ніяк ня мог асьвятліць з такімі зьявішчамі прывяло да таго, што разбазарваньне лёну набыло масавы характар. У радзе калгасаў («Адказ інтэрвэнтам», «Чырвоны Кастрычнік» і інш.) значная колькасьць лёну знаходзіцца пад сьнегам, і ніхто на гэта не рэагуе.

Значная частка сельсаветаў і партыйных ячэек зусім ня кіруюць загатоўкамі. У Паршынскім, Кацялёўскім сельсаветах на працягу некалькіх гадзін нельга было нават знайсьці пляну лёназагатовак. Зьвестак аб ходзе выкананьня пляну па калгасах і па аднаасобным сэктары ў сельсавеце не аказалася. «Нам з раёну ня прыслалі зводкі»—зьдзіўлена адказалі сельсаветчыкі.

Камэнтарыі непатрэбны. Кіраўніцтва зямельна-калгасных раённых арганізацый (у прыватнасьці загатоўчых) пераапрацоўкай і загатоўкай лёну ў большасьці зводзіцца да гастралёрства і зьбіраньня зводак. Райкалгасаюз і МТС ня ведаюць сапраўдных прычын адставаньня калгасаў. Досыць адзначыць, што ўпаўнаважаны райкалгасаюзу Тарасенка, пабываўшы за некалькі дзён у Чарняўскім і Ждановіцкім сельсаветах і пасьпеўшы пераехаць у Паршынскі, ніяк ня мог асьвятліць становішча загатовак лёну па сельсаветах, у якіх ён быў. Пры кожным сельсавеце ёсьць упаўнаважаныя раёну, а ў асобных—нават два. Роля гэтых упаўнаважаных вельмі вялікая. Аднак, упаўнаважаныя часта прыяжджаюць у сельсавет, не выяжджаюць у калгасы і, сабраўшы зьвесткі, хутка выяжджаюць. На справе сельсаветы і калгасы ад такіх упаўнаважаных не атрымліваюць належнай дапамогі ў рабоце. Інакш, як гастралёрствам характарызаваць гэта нельга, бо аб усіх гэтых агідных фактах разбазарваньня лёну ўсе упаўнаважаныя быццам ведалі, але ніхто з іх ніякіх мер ня прыняў. Характарна, што ў Па

САПРАЎДНАЯ БЕЗАПАСНАСЬЦЬ—У РАЗБРОЕНЬНІ ЎСІХ КРАІН

Прамова тав. Літвінава

ЖЭНЕВА, 25 лютага. (Спец. кар. ТАСС). Генеральная камісія канферэнцыі па разброеньні прыступіла сёньня да абгаварэньня дэбатаў, унесеных учора, рэзалюцыі тав. Літвінавым і Саймонам.

У пачатку пасяджэньня з прамовай выступаў з вялікай увагай, выступіў тав. Літвінаў.

«Я ня думаў, што мне першым прыдзецца выступаць у камісіі ў сувязі з рэзалюцыяй аб усеагульным і поўным разброеньні. Я думаў, што гэтая рэзалюцыя лічыцца ўнесенай і абгрунтаванай заявай, зробленай мною на канферэнцыі 11 лютага, і што мне прыдзецца толькі адказваць на магчымыя супярэчныя іншых делегатаў.

Я, аднак, ахвотна сьледую заклику, зробленаму ўчора ў камісіі, аб новым выступленьні ў карысьць поўнага разброеньня, і асабліва рад, што гэты заклік выкотвіць ад пазаканага прэм'ера Францыі Тардзье.

Задача дню—максымальная безапаснасьць супроць вайны

Я, аднак, ня маю намеру злоўжываць заклікам і адніміць шмат часу ў камісіі падрабязным паўтарэньнем усіх тых матываў у карысьць поўнага разброеньня, якія я прыеёў ужо на канферэнцыі. Я толькі коратка напомню іх.

Асноўныя тэзісы нашы зводзяцца да таго, што пагроза новай вайны зараз больш рэальная, чым калі-б та ні было (калі наогул можна казаць аб пагрозе, калі вайна ўжо вядзецца), што новая вайна ўжо пагражае чалавецтву большымі жахамі зьнішчэньня, чым калі-б ні было, што яна пагражае асаблівымі нашчасьцямі ва ўмовах сучаснага крызісу працоўным, што задачай дню зьяўляецца стварэньне максымальнай безапаснасьці супроць вайны і што гэтая безапаснасьць ня можа быць ажыцьцёўлена іншымі шляхамі, як поўнай ліквідацыяй і зьнішчэньнем узброеньняў і розных іншых ваенных фактараў.

Праўда, савецкая прапанова была ўжо загадзя адхілена ў падрыхтоўчай камісіі, у якой былі прадстаўлены ўсе буйнейшыя і найбольш значныя дзяржавы. Мы, тым ня менш, дазваляем сабе зноў паставіць гэтыя прапановы перад канферэнцыяй, бо дзе гаты камісіі, між іншым, спасылаліся на абмежаванасьць сваіх паўнамоцтваў, недастатковасьць іх інструкцый і на іншыя фармальныя прычыны, на якія цяпер-ці зможа спасылацца канферэнцыя, якая складаецца з прадстаўнікоў амаль усіх існуючых дзяржаў як членаў, так і ня-членаў Лігі нацый, і прытым прадстаўнікоў найбольш адказных, найбольш кваліфікаваных для прыняцьця самых сур'ёзных рашэньняў.

Апрача таго, нашы прапановы зроблены былі пяць год таму назад, а за гэты час, мне здаецца, можна было шмат чаму навучыцца на адбываўшыхся за гэты час падзеях. Пяць год таму назад капіталістычны сьвет перажываў росквіт так званага пацыфізму.

Магчымасьць новай вайны даказана тым, што яна ёсьць

Шмат хто думаў, што пад уплывам вурокаў апошняй сусьветнай вайны магчымасьць новай вайны бязупынна зьмяншэцца, што людзкая совесьць і грамадзкая думка не дапусьцяць новай вайны, што варта толькі яшчэ больш развіць сыстэму міжнародных згодніцтваў і пактаў,— і вайну можна будзе зусім адхіліць з міжнароднага абыходу.

Калі прадстаўляемая мною краіна, грунтуючыся на адносінах існуючых, в яшчэ больш як існуючых у яе з іншымі краінамі, выказвала боязьнь, што яна можа падвергнуцца нападу з боку капіталістычных дзяржаў, дык гэта характарызавалася як ледзь ні манякальная мяцельнасьць, а тым больш вайна пачне несавецкімі дзяржавамі лічылася зусім выключнай. Магчымасьць новай вайны, аднак з дастатковай відавочнасьцю даказана зараз тым, што яна ўжо ёсьць, а магчымасьць яе далейшага пашырэньня або паўтарэньня ў большым маштабе ня можа быць адмоўлена пры ўліку ўсё больш абастраю чыхся супярэчнасьцяй паміж дзяржавамі.

„Вайна—гаспадарчае прадпрыемства буйнага маштабу"

У капіталістычным друку вайна цяпер абгаварэцца як праблема актуальная палітыкі, як сродак разрашэньня эканамічнага крызісу. Вось што гавораць, напрыклад, цынераціны капіталісты:

«Ні адзін урад ніколі яшчэ не прыпыняў ніводнага крызісу іншым спосабам, апроч вайны. І калі падобны выхад з крызісу прадстаўляў сваю небясьпеку, то небясьпечна таксама ня паспрабаваць гэта зрабіць». Гэта было сказана перад абранай аўдыторыяй эканамістаў-статыстаў у Вашынгтоне 29 сьнежня 1931 г. Я дазваляю сабе прывесьці вам таксама некалькі цытат з часопісаў:

«З пункту гледжаньня цьвярозага эканамёта—ніша адзін часопіс—вайна зьяўляецца гаспадарчым прадпрыемствам буйнага маштабу. Перафразіруя знаёмыя словы Клаўзэвіца, можна сказаць, што вайна ёсьць працяг гаспадараньня другімі сродкамі».

«Кожная краіна атрымала-бы толькі палёгку ад вайны, яшчэ больш доўгай і крывавай, чым апошняя».

«У час вайны справы некаторых краін заўсёды палепшаюцца. Большасьць краін сьвету ў сучасны момант настолькі не здаволены існуючымі ўмовамі «бізнесу», што для іх мае сэнс адважыцца рызыкуць перспэктывы вайны».

Далей: «Мы папрацілі мільёны даляраў на самыя лепшыя ўзброеньні, і вельмі напрыемна бачыць гэтыя ўклады, чыя знаходзяцца без патрэбы і ня прыносяць даходу».

Аўтар гэтых сэнтэнцый лічыць асноўнай прычынай сёнешняга крызісу перанасяленьне, ад якога ён прапануе нам унікнуць канібалізмам у форме вайны. Я не называю ні аўтараў артыкулаў, ні часопісаў, каб не стварыць ім рэклямы, але патоў даць гэтыя назвы ўсім жадаючым.

Падобныя артыкулы не маглі-бы зьявіцца ў друку 5 год назад: яны цяпер—адзначэньне часу і сымптом таго вумнастрою, які пераважае абвастронымі супярэчнасьцямі.

Транспарт за транспартам ваеннай амуніцыі ваюючым дзяржавам

Пры існаваньні падобнага вумнастрою не прыходзіцца зьдзіўляцца, што ў той час як Савет Лігі нацый пасылае заклікі да ваюючых на Далёкім Усходзе дзяржаў аб прыпыненьні ваенных дзействаў, а делегаты на конфэрэнцыі выражаюць сваё нездаволеньне з прычыны крывапраліцьця на Ўсходзе,—што ў гэты-ж час паўтараю, некаторыя краіны свабодна і адкрыта са згоды свайго ўраду пасылаюць транспарт за транспартам ваеннай амуніцыі ваюючым дзяржавам для прадаўжэньня і ўзмацненьня крывапраліцьця.

Ці не даказвае гэта, што міжнародныя супярэчнасьці і інтарэсы, якія ставяць за ўзброеньнямі, за ваеннай прамысловасьцю, сілы ня ўсякіх пажаданьняў і рэзалюцый пацыфістаў асобных партыкоў, груп і нават партый? Ці не даказвае гэта і таго, што падобнаму палажэньню рэчаў немагчыма палажыць канец інакш, як поўным скасаваньнем і зьнішчэньнем узброеньняў, усеагульным і поўным разбраеньнем? Я мог-бы абмежавацца

сказаным абгрунтаваньнем рэзолюцыі аб поўным разбраеньні і даць магчымасьць другім дэлегатам указаць, якія па іх думцы, існуюць перашкоды да ажыцьцёўленьня гэтай прапановы. Я баюся, аднак, што тут могуць быць выказаны тыя-ж супярэчнасьці, якія мы чулі ў падрыхтоўчай камісіі, і мне здаецца, што я з'эканомлю генэральнай камісіі час, калі я сам дазволю сабе напомніць ёй гэтыя супярэчнасьці і даныя мной на іх адказы.

Безапаснасьць—у поўным разброеньні

У ўжо казаў аб супярэчаньнях фармальнага характару. Да ліку іх трэба таксама аднесьці спасыланьні на 8-мы артыкул статуту Лігі нацый, які абавязвае, быццам, членаў Лігі скарачыць свае ўзброеньні толькі да ўзроўню, сумяшчальнага з безапаснасьцю. Але, зносячы нашы прапановы аб поўным разброеньні, мы не абгрунтоўваемся на якіх-небудзь абавязацельствах дзяржавы—ўдзельніцкай канфэрэнцыі, і не прадпіўваем ніякіх патраабаваньняў. Мы пытаемся ў іх не аб тым, што яны абавязаны зрабіць, а аб тым, што яны згодны зрабіць, г.зн. ці згодны яны разам з Савецкім Саюзам разбраіцца цалкам, каб выгнаць вайну з міжнароднага абыходу і каб адмовіцца ад вайны ў якасьці сродку гаспадараньня. Пры гэтым мы зусім не ігнаруем ўмовы безапаснасьці, але мы кажам, што гэта беза паснасьць і безапаснасьць для ўсіх краін можа быць дана толькі поўным разброеньнем.

Але, апрача фармальных, мы чулі ў падрыхтоўчай камісіі і супярэчаньні па сутнасьці.

Нам казалі, напрыклад, што нават пры зьнішчэньні пастаянных армій і флёту прадзецца захаваць пагранічную варту для барацьбы з кантрабандызмам, паліцэйскую сілу, пажарныя каманды, лясную варту, канвойныя каманды і г. д., і што гэтай узброеной сілы досыць будзе для нападу адных краіны на другія.

Не падлягае сумненьню, што ў выпадку поўнага разброеньня немагчыма будзе прадставіць кожнай дзяржаве пад відам паліцэйскай, пагранічнай або іншай варты стварыць сабе на свой погляд і без абмежаваньня тую ці іншую патэнцыяльную ўзброеную сілу і што неабходна будзе адпаведная міжнародная канвэнцыя для ўрэгуляваньня гэтага пытаньня. Такая канвэнцыя, магчыма, прадставіць дзьвюм суседнім дзяржавам права мець адноль каваю колькасьць пагранічнай варты па абодвых баках граніцы. Што датычыць паліцыі, дык яна магла-б прадстаўляць сабою патэнцыяльную армію толькі ў тым выпадку, калі-б было прызнана неабходным узброіваць яе кулямётамі, танкамі, артылерыяй, апрутнымі газамі, бамбавозамі і г. д.

Мы, аднак, такой неабходнасьці ня прызнаем. Пры пакаданьні-ж шалёўшай прасьцейшай зброі трудна дапусьціць, каб якая-небудзь дзяржава магла цалкам мабілізаваць яе і сьцягнуць яе на граніцы з усіх гарадоў і вёсак, каб наміраваць на суседнюю краіну. Мы ведаем, што якраз для вайны і для вядзеньня вайны дзяржава ўзмацняе органы, прызначаныя для падтрыманьня ўнутранага парадку, і ніколі не пасьмее адцягнуць паліцэйскія сілы ад іх простых абавязкаў. Па такіх-ка меркаваньнях немагчыма і мабілізацыя ваенных команд, а мабілізацыя пажарных команд, безумоўна, не заслугоўвае сур'ёзнага абгаварэньня.

Нам казалі, таксама, што нават у выпадку зьнішчэньня армій і сучаснай зброі людзі па самой натуры ня змогуць адмовіцца ад бойкі і народы будуць кідацца адзін на аднаго з самай прымітыўнай зброяй і нават біцца на кулаках. Але мы думаем, што невялікай пагранічнай варты будзе зусім дастаткова для адбіцьця падобнага роду атак.

Ды і наўрад-ці цывілізацыя «колькі-небудзь прайграла-б ад таго, калі-б на Далёкім Усходзе, напрыклад, замест абмену знарадамі з цяжкіх гармат і бомбамі з паветра, як справаджаецца зьнішчэньнем тысяч людзкога жыцьця і маемасьці, там адбывалася-б зараз толькі бойка на кулаках.

Другія „аргумэнты" супроць разброеньня

Падавалася нібы і больш сур'ёзнае супярэчаньне. Нам указвалі, што і пасьля поўнага разброеньня найбольш індустрыяльна развітыя краіны маглі-б стварыць сабе новыя ўзброеньні і напасьці на неўзброеных суседзяў. Гэта спасыланьне на магчымасьць парушэньня канвэнцыі можа служыць аргумэнтам супроць любой канвэнцыі і супроць канвэнцыі аб абмежаваньні ці скарачэньні ўзброеньняў.

Калі дапусьціць што адны дзяржавы будуць лёяльна выконваць канвэнцыю, а другія ў парушэньне не тайна пазбягаючы устаноўленыя для іх канвэнцыяй ўзброеныя сілы, дык бязумоўна створыцца пагроза безапаснасьці для лёяльных краін.

Калі выходзіць з гэтага, дык немагчыма заключыць ніякія міжнародныя згоды. Я ўжо ўказваў на пленуме канфэрэнцыі, што пры ўсеагульным разбраеньні кантроль над захаваньнем канвэнцыі нязмерна больш просты і больш эфэктыўны, чым пры скарочаньні ўзброеньняў. Стварэньне запова вытворчасьці ваенных матар'ялаў, мабілізацыя вялікіх атрадаў пры эдсутнасьці ўсякага вучоту, узброеньне і экіпіроўка іх патрабуюць вельмі доўгага часу, каб гэта магло прайсьці не заўважаным. Незалежна вы не пабудуеце ня толькі дрэдноута, але нават і падводнай лодкі, далёкабойных гармат ці газаматаў.

Можна мець добрую мэталюргічную ці хімічную базу ў краіне, можна ўла даць вялікай колькасьцю і шчыльнасьцю насельніцтва, але для таго, каб гэтыя патэнцыяльныя сілы пераварылися ва ўзброеную армію, патрэбны складаныя і зацяжныя працэсы, патрэбны добрыя ваенныя кадры, патрэбна вывучка іх, патрэбны зацяжныя тэрміны для таго, каб прыезьці ў дзейства складаны мэханізмы вайны. Ва ўмовах сучаснай ваеннай тэхнікі толькі сыстэматычна перанавучаныя рэзэрвісты прадстаўляюць каштоўнасьць для арміі. Тэхніка настолькі рухаецца наперад, што ва паўторных зборах прыходзіцца перанавучаць радавых салдат, унтэр-афіцэраў і нават афіцэраў. Таму скасаваньне зайсковай павіннасьці, поўнае зьнішчэньне вучотных даных для мабілізацыі рашуча скасуюць усякую магчымасьць окарыстаньня арганізаваных мас для ваенных мэтаў у кароткія тэрміны.

Нарэшце, ці-ж сучасныя патэнцыяльныя сілы адноль каваы ва ўсіх дзяржавах? Ці-ж існуе роўнасьць безапаснасьці з гэтага пункту гледжаньня?

Ці-ж прамыслова разьвітыя дзяржавы ня могуць у выпадку вайны мабілізацыяй прамысловасьці стварыць са бе вялізарную перавагу над сіламі менш прамыслова разьвітых, а тым больш аграрных краін?

Ці-ж не відавочна, што разьвіцьцё і пашырэньне існуючай ваеннай прамысловасьці, існуючых ваенных кадраў больш ажыцьцявіма, больш рэальна, чым стварэньне заново зьнішчанай ваеннай прамысловасьці ці стварэньне армії з ненавучаных народных мас? Ды і ці мысьлімо будзе мабілізацыя гэтых мас для ваенных патрэб, калі гэтыя масы ня будуць мець перад сабой узброенага працоўніка і ня будуць баяцца нападзеньня з яго боку? Бо і цяпер стварэньне армії і мабілізацыя для вайны магчыма толькі пры ўплыве на ўяўленьне народных масам фактыўнай ці сапраўднай пагрозы нападзеньня на іх краіну. Пры ўсеагульным разбраеньні нельга будзе гэтых фікцый стварэць, і ўжо па гэтым адным немагчыма будзе падрыхтоўка да вайны. Нам пратэгаляецца, што па гэтай-жа прычыне неістотны апасеньні, нібы ў бліжэйшыя гады магчыма будзе мабілізаваць тых рэзэрвістаў, якія атрымалі ваенную падрыхтоўку і адукацыю да ўсеагульнага разбраеньня.

Мы глыбока пераканаты ў тым, што толькі роўнасьць ў адфтвасьці ўзбраеньняў, роўнасьць на нулі створыць сапраўдную гарантыю безапаснасьці для ўсіх народаў, што гэтае пачуцьцё безапаснасьці будзе настолькі сільным, што ні ў аднэй краіне ўрад ня зможа, калі нават захоча, мабілізаваць адны народы для нападу на другія.

Я, здаецца, пералічыў важнейшыя супярэчаньні, якія раблісся ў падрыхтоўчай камісіі супроць поўнага разбраеньня. Я гатовы дапусьціць магчымасьць новых супярэчаньняў, невыказаных яшчэ ў падрыхтоўчай камісіі. Мы ахвотна выслухаем іх тут. Мы, аднак, упэўнены ў тым, што як-я-б дэфэкты не маглі быць знойдзены ў прапануемай намі схэме, перазагі яе зусім іх перакрываюць. Другой альтэрнатывы няма. Другой гарантыі супроць вайны мы ня бачым. Яе не дае ні скарочаньне ўзброеньняў ні тым больш абмежаваньне ўзброеньняў і скасаваньне тых або іншых сродкаў узброеньняў.

Разброеньне—гарантыя ад новай інтэрвэнцыі

Дзяржава, якую я маю чэсьць прадстаўляць, дарыжыць ня менш, а мабыць больш сваёй незалежнасьцю чым ся іншыя дзяржавы. Яна адчувае патрэбу ў безапаснасьці ня менш, а больш, чым іншыя дзяржавы.

Заваяваўшы сябе гераічнымі намаганьнямі сапраўдную свабоду, рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу пасьля зьнясьляючай сусьветнай вайны павінны былі дадаткова 3 гады ўзброеный рукой абараняць гэтую свабоду супроць замахаў на яе знутры і зьвонку.

Потым 12 год яны з вялічэзным энтузіязмам працуюць над закладаньнем фундаманту новага ладу.

Яны ажыцьцявілі вялічэзныя эканамічныя планы, якія чыню некалькі год таму назад па-за Савецкім Саюзам, характарызаваліся як утопія.

Яны ведаюць, што парушэньне безапаснасьці іх дзяржавы чужаземнае ўтарженьне можа папрацаваць зьнішчэньнем пабудаванага імі фундаманту, зьнішчэньнем надзей на хуткае ажыцьцяўленьне посага ладу.

Тым ня менш яны не адчулі-б ніякай пагрозы сабе ад зьнішчэньня ўзброеных сіл Савецкага Саюзу, пры ўмове зьнішчэньня ўзброеных сіл і іншых дзяржаў. Наадварот, у іх узмоцніцца пачуцьцё безапаснасьці, і яны зусім ня будуць баяцца нападу неўзброеных народных мас іншых краін, ня гледзячы на тое, што Саюз прытыкаць з такімі колькасна перавышаючымі яго народамі, як кітайскі і індыйскі.

Поўнае ўсеагульнае разброеньне не стварае небясьпекі і для іншых народаў.

Але якія-б ні былі адносіны іншых дзяржаў да прапановы аб поўным разбраеньні, Савецкі ўрад ня можа не прайсьці міма магчымасьці, якую прадстаўляе для яго сучасная суседняя канфэрэнцыя для пастаноўкі праблемы аб поўным разброеньні.

Калі не на сучаснай канфэрэнцыі, дык дзе-ж гэта праблема можа быць пастаўлена? Галасаваньне па гэтым пытаньні, незалежна ад яго зьніку, будзе поўна глыбокага тэатрычнага значэньня і ня пройдзе бясьсьледна ў гісторыі міжнародных адносін. Вось чому я дазволю сабе рэкамэндаваць вашай увазе і паставіць на ваша абгаварэньне савецкі праект рэзалюцыі».

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

ПА ДАКЛАДАХ РАГАЧЭЎСКАГА, КАПЫЛЬСКАГА І КЛІМАВІЦКАГА РАЁННЫХ ВЫКАНАЎЧЫХ КА МІТЭТАЎ АБ ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ І РАБОЦЕ РАЁННЫХ ЭКСПАРТНЫХ НАРАД.

Заслухаўшы даклады Рагачэўскага, Капыльскага і Клімавіцкага раённых выканаўчых камітэтаў аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў і рабоце раённых экспартных нарад, Савет Народных Камісараў БССР устанаўляе, што раённымі выканаўчымі камітэтамі памянённых раёнаў у галіне мабілізацыі сродкаў ня было забясьпечана штодзённае апэрацыйнае кіраваньне работай сельскіх саветаў і вакол здачы выкананьня фінансавага пляну ня была разгорнута шырокая арганізацыйна - масавая работа, у выніку чаго пляны мабілізацыі сродкаў, асабліва па лініі дабраахвотных плацяжоў, сыстэматычна недавыконваюцца. Савет Народных Камісараў БССР асабліва адзначае яўна незадавальняючае спагчаньне абазязковых плацяжоў з кулацкіх гаспадарак у Капыльскім і Клімавіцкім раёнах.

Рагачэўскі, Капыльскі і Клімавіцкі раённыя выканаўчыя камітэты таксама не сваячвалі належнай увагі на выкананьне экспартнага пляну. Раённыя экспартныя нарады зусім не працуюць і не ажыцьцяўляюць належнага кіраваньня работай па выкананьні экспартных заданьняў.

Выходзячы з таго, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Работу Рагачэўскага, Капыльскага і Клімавіцкага раённых выканаўчых камітэтаў у галіне мабілізацыі сродкаў прызнаць неадавальняючай, а таксама прызнаць неадавальняючай работу Клімавіцкага раённага выканаўчага камітэту ў галіне выкананьня экспартных заданьняў.

За сыстэматычнае невыкананьне пляну мабілізацыі сродкаў і няўкананьне належных заказаў, якія забясьпечылі-б выказ раёну з пасаны фінансавых прарываў, а таксама за дапушчаную бязьдзейнасьць экспартных нарад, што прывяло да невыкананьня экспартных заданьняў па памянёных раёнах, старшыням Рагачэўскага, Капыльскага і Клімавіцкага раённых выканаўчых камітэтаў т. т. Машыц, Вайцахоўскаму і Берговіну абвясьціць вымову і папярэдзіць іх аб тым, што калі ў бліжэйшы час ня будуць ужыты належныя захады, якія забясьпечылі-б узорную пастаноўку работы ў адзначаных галінах, будзе пастаўлена пытаньне аб адольнасьці раённага кіраўніцтва памянёных раёнаў справіцца з пастаўленым перад імі задачамі.

2. Для перабудаваньня работы ўсяго раённага апарату ў кірунку выкананьня пастаўленых у галіне мабілізацыі сродкаў і экспартнага пляну задач, прапанаваць Рагачэўскаму, Капыльскаму і Клімавіцкаму раённым выканаўчым камітэтам правесьці ступныя мерапрыемствы:

А. Па лініі мабілізацыі сродкаў.

а) Устанавіць сыстэматычнае дыфэрэнцыраванае кіраваньне работай сельскіх саветаў, для чаго планы мабілізацыі сродкаў даводзіць да сельскіх саветаў па ўсіх плацяжох, дабіцца своячасовай дачы сельскімі саветамі справаздачных вестак, завесьці палёкадны ўлік выкананьня пляну ў разрэзе пасобных плацяжоў і сельскіх саветаў і сыстэматычна заслухоўваць даклады сельскіх саветаў, устанаўліваючы для гэтага календарны план;

б) у аснову работы пакласьці шырокую арганізацыйна - масавую работу, мабілізаваўшы на гэту оправу грамадзкія арганізацыі і асабліва ўвагу зьвярнуўшы на стварэньне і належнае ўлік шырокага сталага фінансавага актыву, у першую чаргу з ударнікаў-рабочых і перадавых калгаснікаў;

в) ажыцьцяўляць сталае абразаньне сацыялістычным спаборніцтвам з іншымі раёнамі і паміж пасобнымі сельскімі саветамі і калгасамі ўнутры кожнага раёну, дабіўшыся такога становішча, каб вынікі ходу сацыялістычнага спаборніцтва абмяркоўваліся на нарадах з шырокім удзелам грамадзкасьці і шырока асьвятлялися ў мясцовым друку.

Для прэміраваньня перадавых сельскіх саветаў і пасобных ударнікаў фінансавага фронту выдзеліць з масавых сродкаў спэцыяльны прэміяльны фонд;

г) асабліва ўвагу зьвярнуць на правядзеньне масавай работы закон апачаткай опраны і дзяржаўных пазык, праз агітацыйна - растлумачальную работу, папулярызацыю тыражой дзяржаўных пазык, праверку вынікаў і належную пастаноўку абслугоўваньня ўкладчыкаў апчаткаўных кас і трымальнікаў аблігацый дзяржаўных пазык;

д) Капыльскаму і Клімавіцкаму раённым выканаўчым камітэтам у дэкадны тэрмін ліквідаваць свае запазычанасьці сялянству па ўсіх загатоўках, лесазагатоўках і лесавывазцы.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР А. Калнін.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.

20 студзеня 1932 г.
г. Менск.
№ 40.

БАЛЯНС

Беларускага Дзяржаўнага Аб'яднаньня Скуранай Прамысловасьці БЕЛСКУРАБ'ЯДНАНЬНЯ на 1-X 1929 г. і на 1-I 1931 г.

АКТЫЎ

	СУМА На 1-X 1929 г.	СУМА На 1-I 1931 г.
Маймасьць	3909013—01	6041804—75
Нясканчаныя набудовы і капіт. рамонт	1062427—38	3391403—60
Абсталяваньне да ўстаноўкі	—	64628—29
Запасное абсталяваньне	133483—25	12224—87
Паі, акцыі, каштоўныя і % % паперы	279616—98	241046—78
Уклады	146484—45	373484—45
Матар'ялы і гатовыя вырабы (тавар.)	281483—36	170843—00
Сыравіна, асноўныя і дапаможныя матар'ялы	1584609—50	617660—07
Паліва	38180 —	43810—90
Паўфабрыкаты	79106—50	85401—59
Нясканчаная вытворчасьць	1433560—87	1712109—73
Грашовыя сродкі	52714—34	10199—64
Разьлікі з Дзяржбанкам	—	326512—75
Дэбіторы	1966265—33	2648875—29
Выдаткі наступных гадоў	31584—87	26118—42
Узносы НКФ і прыбыткаў	—	1733142—54
	10998529—84	17499266—67

ПАСЫЎ

	СУМА На 1-X 1929 г.	СУМА На 1-I 1931 г.
Статутны капітал	3707581—58	4390600—57
Амартызацыйны капітал	258666—27	501547—29
Іншыя капіталы	865847—97	460854—89
Фонды:		
а) ФПБР	84859—52	237740—73
б) Іншыя	14923—60	44872—91
Рэзервы	60783—24	183666—89
Бюджэтнае фінансаваньне	236000 —	916000 —
Доўгатэрміновае »	300000 —	1618696—62
Кароткатэрміновае »	11289—69	—
Разьлікі з Дзяржбанкам	—	2428313—69
Крэдыторы	3715816—43	3212877—20
Прыбыткі наступных гадоў	—	—
Прыбытак	2242761—54	2901487—53
» асобай квадры	—	602608—35
	10998529—84	17499266—67

Рахунак прыбыткаў і страт

СТРАТЫ

	СУМЫ За 1929-30 г.	За асобную квадру	За 15 месяцаў
Ад рэалізацыі	39239—39	200702—16	239941—55
Проц. за лічаныя	457382—15	76344—82	51[illegible]726—97
Агульнагам. выд.	133981—32	34906—71	168888—03
Выдаткі на збыту	1801482—51	882619—20	2684101—74
Іншыя выдаткі	1489732—07	536773—53	2026505—60
	3901817—47	1731346—42	5633163—89

ПРЫБЫТКІ

	СУМЫ За 1929-30 г.	За асобную квадру	З 15 месяцаў
1. Ад рэалізацыі	6471906—15	2151112—97	8623049—12
2. Проц. атрыманыя	59629—39	21464—14	81093—53
3. Іншыя прыбыткі	271769—46	161347—66	433117—12
	6803305 —	2333954—77	9137259—77

Асноўныя паказчыкі гаспадарчай дзейнасьці

		Па пляну на 1930 г.	Фактычна за 1930 г.
Выработка асноўных відаў прадукцыі натуры:	буйн. ск.	320000 шт.	328700
	д обн.	1239000 шт.	1207600
	абутак	2857000 пар.	2390100
Валавая прадукцыя па сабекошту		38411000	29681000
Рэалізацыя па адпускным цэнам		43881000	37333000
Сярэдні гадавы лік рабочых		3933	4207
» » » служачых		227	358
Фонды зарпляты рабочых		4449000	4968000
» » служачых		375000	628000
Зьніжэньне сабекошту ў параўнаньні да мінулага году		8,5	5,3
Капітальныя ўкладаньні		3232700	4050000
У тым ліку на новыя прадпрыемствы		1881000	1710000
Здадзена ў эксплёатацыю		—	2143000
У тым ліку новых прадпрыемстваў		—	1327000

Разьмеркаваньне прыбыткаў

За 1929-30 год

Унесена ў бюджэт як датэрміновыя выняткі з прыбыткаў	890000 —
11 проц. з астатку ў фонд палепшаньня быту рабочых	221263—62
На павялічэньне статутнага капіталу	1790253—91
	2901487—53

За асобную квадру

9 проц. ў фонд палепшаньня быту рабочых	54234—75
10 проц. ў сацыяльны капітал	60260—83
81 проц.—у фонд бюджэту	488112—77
	602608—35

Кіраўнік Белскураб'яднаньня ЭПШТЭЙН

Галоўны бухгальтар С. М. ПЕРЭЛЬМАН

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня — КЕНІГСМАРК

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз — Замежны фільм АПОШНІЯ НАВІНЫ

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" — Монці Бэнкс Сапраўдны джэнтльмэн

Аршанскі Мясапрамысловы Тэхнікум
АБВЯШЧАЕ
ДАДАТКОВЫ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ на 1-ы КУРС
убойна-разьдзелачнага аддзяленьня ў колькасьці—20 чал.
Умовы прыёму і патрэбныя дакументы, згодна агульным правілам аб прыёму студэнтаў у тэхнікум.
Прыём заяў праводзіцца ў канцылярыі тэхнікуму штодзённа з 9 гадзіны да 3 гадз. дню, за выключэньнем выхадн. дзён: 2, 7, 12, 17, 22, 27
Паштовы адрас: Ворша, Ленінская, 16
Дырэктар Тэхнікуму ФАМІН

ПАСТАНОВА

Галоўны Арбітр пры СНК БССР на падставе пастановы СНК СССР за 8-XII 31 г. „Аб мерах узмацненьня работы органаў Дзяржаўнага арбітра" (З. З. СССР 1931 г. № 70, арт. 470)

ПАСТАНАВІЎ:

кіраўніка групы вучоту Бел. Канторы Саюзмяса тав. Дуброва і работніцу па вучоту Белхлебжывёласаюза тав. Чарняўскую аштрафаваць кожнага па 50 руб. за дапушчаную імі заблытанасьць бухгальтарыі па вучоту рэалізацыі заключанага паміж Белмясам і Белхлебжывёласаюзам дагавору, што выявілася пры разглядзе справы па спрэчцы старон аб 98.182 руб. 02 кап.

Галоўны Арбітр пры СНК

10 лютага 1932 г.

Менская гарадзкая партызанская камісія

ПРАПАНУЕ

ўсім чырвоным партызанам, чырвонагвардзейцам, і членам сем'яў загінуўшых чырвоных партызан, маючым чырвонагвардзейскія партызанскія білеты, пражываючым у горадзе Менску і яго сельсаветах

ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА з прычыны пачаўшайся праверкі партызанскай камісіі.

Тэрмін рэгістрацыі з 1-III па 10-III штодня ад 1—4 і ад 7—10 гадз. увеч.

Незьявіўшыяся бяз уважлівых прычын на перарэгістрацыю будуць пазбаўлены ільгот і будуць лічыцца аўтаматычна выбыўшымі

Старшыня партызанскай камісіі ЯРОШАЎ

АПАВЯШЧЭНЬНІ

ПК ЦКК КП(б)Б просіць КАРЧЭЎСКАГА СТАНІСЛАВА КАЗІМІРАВІЧА (Жлобінскі раён), НІКАЛАЕВА (Жлобінскі р-н, Станцыённы К-т) і ВЕРЭША Еўгена Сьцяпанавіча зайсьці ў ПК ЦКК КП(б)Б, альбо паведаміць свой адрас.

Просьба да ўсіх арганізацый і т. т. ведаючых месца знаходжаньня вышэйпамянёных т. т. паведаміць у ПК ЦКК КП(б)Б (Менск, Савецкая 55).

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б СУХАНАВА.

28-II, а 7 гадзіне ўвечары, у доме Асьветы, адбудзецца агульны сход навуковых працаўнікоў разам з асьвятнікамі г. Менску.

Даклад тав. Галадзеда аб рашэньнях XIV партзьезду і XVII партканфэрэнцыі.

Гарком.

Работы Усебеларускай нарады па кадрам адбываюцца 26, 27 і 28 лютага ў памяшканьні дому Камасьветы (ўваход з вуліцы Карла Маркса) з 10 да 3 гадз. дню і ад 6 да 9 гадз. ўвечары.

Сакратар Аддзелу Кадраў ЦК КП(б)Б ПРОЮМ.

Нам. адказнага рэдактара Г. АДАМСОН.

Друкарня імя СТАЛІНА.

Упаўнав. Галоўлітбел № А—53.